# ЗАСТАВАЙЦЕСЯ СА «ЗВЯЗДОЙ»!

**ІДЗЕ ПАДПІСКА НА IV КВАРТАЛ 2009 ГОДА**

**Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)**

| Індэкс | | на 1 месяц | на 3 месяцы |
|---|---|---|---|
| 63850 | (індывідуальны) | 10600 | 31800 |
| 63145 | (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны) | 9990 | 29970 |
| 63858 | (ведамасны) | 17050 | 51150 |
| 63239 | (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя) | 15550 | 46650 |



WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

25 ВЕРАСНЯ 2009 г. ПЯТНІЦА № 181 (26539)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.


## Прэзідэнт паставіў перад Мінпрамам задачу павялічыць да канца года тэмп росту прамысловай вытворчасці да 80 працэнтаў

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даручыў правесці поўную мадэрнізацыю і тэхнічнае пераўзбраенне Мінскага падшыпнікавага завода. Такую задачу кіраўнік дзяржавы паставіў 24 верасня, наведваючы ААТ «Мінскі падшыпнікавы завод».**

Мінскі падшыпнікавы завод — адно з найбуйнейшых прадпрыемстваў машынабудаўнічага комплексу Беларусі і адзін з вядучых вытворцаў падшыпнікаў як у Беларусі, так і ў краінах СНД. Сёння тут працуюць больш як 4 тыс. чалавек.

Падшыпнікі, што выпускаюцца на прадпрыемстве, выкарыстоўваюцца практычна ва ўсіх галінах прамысловасці. Амаль 65 працэнтаў прадукцыі пастаўляецца на экспарт. Акрамя таго, значная частка прадукцыі для ўнутранага рынку потым таксама экспартуецца ў складзе тэхнікі МАЗа, МТЗ, БелАЗа, «Гомсельмаша», «Амкадора» і іншых прадпрыемстваў. У сувязі з гэтым ваганні попыту на знешніх рынках непасрэдна ўплываюць на аб'ёмы вытворчасці.

Прадпрыемству дзяржавай неаднаразова аказвалася фінансавая дапамога ў выглядзе субсідый (напрыклад, у 2008 годзе — Br26 млрд). Аднак цяпер сітуацыя на заводзе застаецца складаная: знос асноўнага тэхналагічнага абсталявання складае 97,8 працэнта, аб'ём вытворчасці ў студзені—жніўні 2009 года ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года скараціўся ўдвая, складскія запасы павялічыліся ў 5,8 раза, экспарт зменшыўся на 65 працэнтаў.

У 2008 годзе Мінскім падшыпнікавым заводам было выпушчана прадукцыі на суму Br172,4 млрд, або Br14,3 млрд у месяц. Цяпер кожны месяц завод вырабляе прадукцыі на суму каля Br10 млрд. Зніжэнне аб'ёмаў вытворчасці звязана з тым, што з-за сусветнага фінансавага крызісу адбыўся спад вытворчаці на большасці прадпрыемстваў металургічнай, горназдабыўной, вугальнай прамысловасці, перш за ўсё на расійскіх і ўкраінскіх, якія з'яўляюцца асноўнымі спажыўцамі падшыпнікаў маркі MPZ.

З мэтай стабілізацыі фінансавага стану завода былі распрацаваны мерапрыемствы, накіраваныя на павелічэнне аб'ёмаў продажаў і асваенне новых вырабаў. Пашырана наменклатура падшыпнікаў, якія пастаўляюцца на ўнутраны і знешні рынкі, вядзецца пошук новых рынкаў збыту. У прыватнасці, цяпер вядуцца перагаворы з Венесуэлай, Кубай, ЗША. Разам з тым відавочна, што без умяшання дзяржавы прадпрыемства не зможа самастойна развівацца і паспяхова працаваць на сусветных рынках.

Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з работай прадпрыемства, пабываў у вытворчых цэхах. Па выніках Прэзідэнт крытыкаваў цяперашні стан завода. «Такіх заводаў быць не павінна. Які інвестар сюды пойдзе?» — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звярнуўшы ўвагу на недагледжанасць і безгаспадарчасць у цэхах і на тэрыторыі завода. Неабходна пачынаць з добраўпарадкавання прадпрыемства, а потым ужо ставіць пытанне аб дзяржпадтрымцы.

Кіраўнік дзяржавы даручыў ураду, Мінпраму, кіраўніцтву завода да канца гэтага года падрыхтаваць прапановы па мадэрнізацыі МПЗ. У найбліжэйшы час неабходна скласці бізнэс-план, вызначыць неабходны аб'ём мадэрнізацыі, прааналізаваць прапановы патэнцыяльных пастаўшчыкоў новага абсталявання, а таксама вызначыцца з крыніцамі фінансавання. У прыватнасці, разглядаецца пытанне прыцягнення замежных доўгатэрміновых крэдытаў з магчымасцю кампенсацыі прадпрыемству дзяржавай працэнтаў па іх, а таксама пытанне прадастаўлення бюджэтнай субсідыі. Потым трэба падрыхтаваць адпаведны праект указа і да канца года ўнесці яго на разгляд кіраўніку дзяржавы. Прэзідэнт лічыць, што мадэрнізацыю завода неабходна пачаць ужо з 2010 года. У цэлым рэканструкцыя павінна быць завершана да 2013 года. Гэта дасць магчымасць павялічыць аб'ёмы вытворчасці на прадпрыемстве ў 3 разы. Прэзідэнт запатрабаваў, каб ужо ў найбліжэйшы час прадпрыемства выйшла на вытворчасць прадукцыі на Br20 млрд у месяц.

У цэлым Аляксандр Лукашэнка паставіў перад Міністэрствам прамысловасці задачу павялічыць да канца гэтага года тэмп росту прамвытворчасці да 80 працэнтаў. «Я подзвігаў не патрабую, — сказаў ён, звяртаючыся да міністра прамысловасці Аляксандра Радзевіча, — але ніжэй за 80 працэнтаў прамысловая вытворчасць упасці не можа. У цэлым хацелася б выйсці на ўзровень 85 працэнтаў».

За восем месяцаў гэтага года вытворчасць прамысловай прадукцыі на прадпрыемствах Мінпрама склала 74,4 працэнта да ўзроўню студзеня—жніўня мінулага года. Усяго вытворчасць прамысловай прадукцыі ў краіне за гэты перыяд склалася на ўзроўні 95,4 працэнта (гадавы прагноз — 110-112 працэнтаў).

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў працягваць працу па скарачэнні складскіх запасаў. У найбліжэйшы час кіраўнік дзяржавы заслухае нядаўна назначаных кіраўнікоў дзяржаўных органаў па выкананні яго даручэнняў, у тым ліку па пытанні зніжэння складскіх запасаў. Гэта серыя дакладаў будзе зроблена ў кантэксце падрыхтоўкі да справаздачы ўрада. Кіраўнікі таксама даложаць аб тым, як яны выконваюць дадзеныя кіраўніку дзяржавы абяцанні.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА, БЕЛТА.

**ВОЧЫ Ў ВОЧЫ**

**Больш як 2000 унікальных аперацый праводзіцца ў Рэспубліканскім цэнтры радыяцыйнай медыцыны ў Гомелі, сярод якіх больш за трэць — аперацыі на вачах з выкарыстаннем камп'ютарных тэхналогій.**

## КАНТРАКТ. АБО БЕСТЭРМІНОВЫ ДАГАВОР?

Федэрацыя прафсаюзаў возьме актыўны ўдзел у правядзенні ў Беларусі Сусветнага дня дзеянняў за вартую працу, што праходзіць традыцыйна 7 кастрычніка. Пры гэтым, як паведаміла прэс-сакратар ФПБ Вольга Зуёнак, у рамках гэтай акцыі прафсаюзы маюць намер у чарговы раз звярнуцца ў Савет Міністраў з прапановай — замацаваць у заканадаўстве норму, паводле якой работнік, што не парушае дысцыпліну, зможа запатрабаваць замену кантракта пасля заканчэння яго тэрміну на бестэрміновы працоўны дагавор.

Адначасова прафсаюзы працягнуць правядзенне маніторынгу фінансава-эканамічнага стану, занятасці і ўзроўню заробкаў у арганізацыях рэальнага сектара эканомікі і бюджэтнай сферы, пракантралююць выкананне калектыўных дагавораў. Апроч таго, прававыя інспектары ФПБ правядуць дадатковыя прыёмы работнікаў з кансультацыямі па заканадаўстве, а тэхнічныя і грамадскія інспектары наладзяць пазачарговыя праверкі ўмоў працы — у прыватнасці, праверкі тэмпературнага рэжыму ў вытворчых і бытавых памяшканнях.

**Сяргей ГРЫБ.**

## НА РЭКАНСТРУКЦЫЮ — ЯШЧЭ ТРЫ ПУНКТЫ

**За апошні час агульная магутнасць пунктаў пропуску на беларускіх межах павялічылася ў 2,5 раза — з 8 да 20 тысяч аўтамабіляў. Пры гэтым, як адзначыў падчас сустрэчы з журналістамі старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Аляксандр Шпілеўскі, укладанні ў інфраструктуру будуць працягвацца і надалей.**

У цэлым прайшлі рэканструкцыю і мадэрнізацыю 9 аўтадарожных пунктаў пропуску: «Брузгі», «Бераставіца», «Казловічы» і «Варшаўскі мост» на польскай, «Новая Гута», «Макраны» і «Новая Рудня» — на ўкраінскай, «Каменны Лог» і «Котлаўка» — на літоўскай мяжы. У той жа час работы не спыняюцца. Цяпер ідзе рэканструкцыя яшчэ двух пунктаў пропуску — «Дамачава» і «Беняконі», а таксама памежнага грузавога тэрмінала «Казловічы-2». Апроч таго, паведаміў Аляксандр Шпілеўскі, сёлета будуць падрыхтаваныя праекты яшчэ па трох пунктах: «Прывалка» на мяжы з Літвой, «Грыгароўшчына» (Бігосава) — з Латвіяй і «Пяшчатка» — з Польшчай. Сёння робяцца захады па прыцягненні на гэтыя аб'екты пазабюджэтных сродкаў у рамках праграмы трансмежнага супрацоўніцтва «Латвія — Літва — Беларусь», якая ўхвалена Еўракамісіяй. Дарэчы, меркаваны кошт кожнага з праектаў — 2,5 млн еўра.

Як падкрэсліў Аляксандр Шпілеўскі, адной з галоўных задач мытні традыцыйна застаецца павелічэнне хуткасці афармлення. У гэтым плане вельмі карысная сістэма электроннага дэкларавання тавараў. На сёння яго здзяйсняюць ужо больш за 800 прадпрыемстваў, на новую сістэму пераведзена 67 % экспарту. Прычым у перспектыве ў электронным варыянце будзе афармляцца і імпарт.

Дарэчы, зазначыў старшыня ДМК, перавагі электроннага дэкларавання — не толькі хуткасць і меншыя выдаткі суб'ектаў гаспадарання. Адначасова новая сістэма дае магчымасць «бескантактнага» афармлення. І ў выніку змяншаецца верагоднасць карупцыі. Гэта, да слова, застаецца праблемай. З пачатку года ўжо спынена 81 спроба дачы мытнікам хабару. За ўвесь мінулы год былі адзначаны толькі 73 падобныя выпадкі.

Не меншай праблемай застаецца і кантрабанда. Сёлета выяўлена 13 593 выпадкі парушэнняў мытнага заканадаўства. Пры гэтым з незаконнага абароту, у прыватнасці, былі канфіскаваныя больш за 56 млн цыгарэт і 6897 прадметаў, што ўяўляюць гісторыка-культурную каштоўнасць.

Асобная гаворка аб стварэнні адзінага Мытнага саюза Беларусі, Расіі і Казахстана. Як вядома, тут мае адбыцца ўніфікацыя пошлінаў, і ў тым ліку на аўтамабілі. Праўда, казаць што-небудзь канкрэтнае па транспартных сродках пакуль нельга. Больш пэўная сітуацыя з перамяшчэннем праз мяжу тавараў фізічнымі асобамі — тут застануцца цяперашнія ўмовы.

Аднак у гэтым выпадку ўсё ж магчыма абмежаванне бяспошліннага ўвозу тавараў фізічнымі асобамі на суму 200 еўра. Як адзначыў начальнік упраўлення арганізацыі мытнага кантролю Мікалай Бурш, ДМК сапраўды ўжо такую прапанову на разгляд Савета Міністраў, і перш-наперш — з улікам сітуацыі на ўкраінскай мяжы. Разам з тым пакуль рашэнне тут не прынятае. «Нам даручана яшчэ раз прапрацаваць гэта пытанне, знайсці дадатковыя абгрунтаванні новаўвядзенню, і мы гэта зробім, — зазначыў Мікалай Бурш. — Тым больш, што норму ў 200 еўра разглядае не толькі Беларусь, але і суседняя Расія».

**Сяргей ГРЫБ.**

## СЛЕСАРА ЎЗНАГАРОДЗІЛІ ЗА ПАГОНЮ

Гэта здарылася раніцай 2 жніўня, калі п'яны вадзіцель з в. Малое Гарадзішча Ляхавіцкага раёна на а/м «Масквіч 2140» зрабіў наезд на 64-гадовую пенсіянерку, якая пераходзіла вул. Брэсцкую ў г. Баранавічы па нерэгуляваным пераходзе. Жанчына загінула, а вадзіцель з места аварыі з'ехаў. У пагоню за ім кінуўся слесар Баранавіцкага аўтаагрэгатнага завода Мікалай Пошва, які на сваёй машыне апынуўся каля месца здарэння. М. Пошва імчаўся за ўцекачом і сігналіў. Неўзабаве яму ўдалася прыціснуць «Масквіч» да абочыны на вул. Камсамольскай. Забраўшы ў п'янага вадзіцеля ключы, грамадзянін Пошва выклікаў міліцыю і паехаў па сваіх справах. І вось праз паўтара месяца Баранавіцкі ГАУС узнагародзіў Мікалая Пошву грашовай прэміяй. Родны завод таксама не застаўся ўбаку.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## ЖУРАВІНЫ ЗДАЮЦЬ НЕАХВОТНА

Калі ў мінулым годзе нарыхтоўшчыкі прымалі ў насельніцтва журавіны па Br4,5 тыс. за 1 кг, то сёлета — толькі па Br1,8 тыс.—Br2 тыс. Зніжэнне закупачных цэнаў у сваю чаргу абумоўлена спадам кан'юнктуры цэнаў на еўрапейскім рынку. Сёння еўрапейскія фірмы прапануюць за журавіны толькі 70—75 еўрацэнтаў, або ў пераліку на беларускія рублі Br2850. Насельніцтва збірае журавіны і трымае іх у сябе ў надзеі на тое, што цана на ягады ўзнімецца, і можна будзе больш выгадна прадаць іх пазней. Але цана наўрад ці вырасце.

**БЕЛТА.**

Фота Аляксандра ХІТРОВА, БЕЛТА.

*Помнік Мікалаю Цудатворцу адкрыты ўчора ў Полацку. Адліты з бронзы помнік вышынёй 3,5 м падараны Полацкай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы расійскім дабрачынным фондам Свяціцеля Мікалая Цудатворца. На пастаменце таблічка: «Гэты помнік узведзены ў гонар наведвання Полацка Свяцейшым Патрыярхам Маскоўскім і ўсяе Русі Кірылам у лета 2009».*

## Аляксандр Лукашэнка павіншаваў удзельнікаў IV Форуму творчай і навуковай інтэлігенцыі краін СНД у Кішынёве

Прывітальнае пасланне кіраўніка беларускай дзяржавы зачытаў дырэктар Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі, паўнамоцны прадстаўнік Беларусі ў Савеце па гуманітарным супрацоўніцтве краін СНД Алег Праляскоўскі.

У віншавальным пасланні Аляксандра Лукашэнкі падкрэсліваецца, што сёння асабліва значэнне набываюць непасрэдныя кантакты дзеячаў адукацыі, навукі і культуры краін Садружнасці. «З'яўляючыся найважнейшым складальнікам міждзяржаўных адносінаў, гэтыя сувязі неабходныя для захавання і прымнажэння агульнай культурнай спадчыны, плённай навуковай творчасці, сумеснага пошуку вырашэння надзённых пытанняў інтэграцыі і сусветных праблем», — гаворыцца ў пасланні.

Бягучы год аб'яўлены Саветам кіраўнікоў дзяржаў СНД Годам моладзі ў Садружнасці. Яе прадстаўнікоў нямала сярод дэлегатаў форуму. Прэзідэнт Беларусі выказаў упэўненасць, што гэта мерапрыемства будзе садзейнічаць выхаванню маладых грамадзян дзяржаў СНД у духу ідэалаў гуманізму, талерантнасці, усебаковага супрацоўніцтва, міру і згоды. Кіраўнік беларускай дзяржавы ў сваім пасланні пажадаў усім удзельнікам форуму моцнага здароўя, невычэрпнай энергіі, поспехаў і дабрабыту.

Форум творчай і навуковай інтэлігенцыі дзяржаў — удзельніц СНД, які адкрыўся ў Кішынёве, праводзіцца ў Малдове ўпершыню. У рабоце форуму ўдзельнічаюць каля 450 вядомых вучоных, дзеячаў мастацтва, дзеячаў у галіне адукацыі краін СНД у складзе 11 дэлегацый — ад Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Расіі, Таджыкістана, Туркменістана, Узбекістана, Украіны.

**БЕЛТА.**

Напярэдадні

## ІМЯ ЗОРКІ

**Чацвёртую восень у Мінск прыязджае народны артыст Расіі Юрый Башмет. У яго тут будзе праца: з 4 па 11 кастрычніка быць галоўнай зоркай фестывалю свайго імя. Але не адзінай. На адкрыцці выступіць ён сам з аркестрам «Новая Расія» ў праграме «Вечар Кармэн». Але асаблівы шарм фестывалю надасць імя Галіны Вішнеўскай, якая асабіста склала праграму аднаго з канцэртаў і, магчыма, прыедзе сама. Акрамя таго, цэлае сузор'е выдатных музыкантаў, якія выступяць у розных канцэртных праграмах, ды яшчэ і прывядуць заняткі ў Моладзевай акадэміі краін СНД, што пашырае фармат «майстар-класаў».**

— Міжнародны фестываль Юрыя Башмета праводзіцца ў адпаведнасці з пастановай Урада Рэспублікі Беларусь, — адзначыў **міністр культуры Беларусі Павел ЛАТУШКА.** — Гэта з'яўляецца сведчаннем нашага стаўлення да гэтай падзеі і гэтага віду мастацтва, падкрэсліваючы яго важнасць, неабходнасць для беларускай культуры, павышае прэстыж краіны за межамі, а таксама спрыяе нашаму ўнёску ў Еўрапейскую культурную скарбонку. Арганізатарамі фестывалю з'яўляюцца Міністэрства культуры і Мінскі гарвыканкам. Мне не даводзілася яшчэ бываць на гэтым фестывалі, і я таксама вельмі чакаю яго адкрыцця.

Затое міністр культуры Павел Латушка бываў у Венскай оперы — трапіў у тэатр па білеце за 10 еўра. Танна, але таму, што давялося сядзець на адным з горшых месцаў. Аднак усё адно быў вельмі рады, бо вельмі хацеў паслухаць Венскую оперу, а білеты ў гэты тэатр — адны з самых дарагіх у Еўропе.

Сярод беларускіх слухачоў, напэўна, ёсць такія, хто не можа купіць білеты па вялікім кошце. У іх ёсць магчымасць трапіць на канцэрт адкрыцця фестывалю, які пройдзе сёлета ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі. У нашым тэатры цяпер ёсць месцы, дзе не вельмі добра бачна, што адбываецца на сцэне, але ўсё адно музыку можна пачуць. Білеты на гэтыя месцы зусім танныя. «Але акустыка ў тэатры нармальная, запэўнівае дырэктар беларускай оперы Валерый Гедройц. — Мы зрабілі захады, каб палепшыць акустыку на сцэне».

Стан Вялікага тэатра Беларусі і яго перспектывы апошнім часам вельмі цікавяць тых, хто любіць хадзіць на оперу і балет. І не толькі ў сувязі з фестывалем Башмета, асобныя канцэрты якога пройдуць у тэатры. Бо фестываль адгучыць, але музыка застанецца — беларуская. Хто будзе вызначаць творчы кірунак, калі да пачатку новага сезона трупу так і не пазнаёмілі з Генеральным дырэктарам тэатра?

— Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета — вядучая культурная ўстанова, — падкрэсліў Павел Латушка. — Таму важным з'яўляецца пытанне прызначэння новага генеральнага дырэктара. Пытанне будзе вырашана ў найбліжэйшы час. Гаварыць аб нейкай кандыдатуры пакуль заўчасна.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

Блізкае далёкае замежжа

## БЕЛАРУСКА-ВЕНЕСУЭЛЬСКАЕ ЎЗАЕМАДАПАЎНЕННЕ

### *Энерганосьбіты ды какава — на тэхніку і харчаванне*

Венесуэла перадае беларускаму боку дадатковыя свідравіны. «Паводле нашых падлікаў, гэта павысіць налета здабычу нафты ў чатыры разы», — паведаміў журналістам пасол Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла Амерыка Дзіяс Нуньес. «Акрамя таго, Венесуэла дала магчымасць Беларусі займацца здабычай газу на вельмі перспектыўных радовішчах, — дадаў дыпламат. — Усе гэтыя дзеянні ўпісваюцца ў рамкі нашага бачання супрацоўніцтва з Беларуссю. Мы вызначаем нашы адносіны як узаемадапаўняльныя». Ён адзначыў, што Венесуэле неабходна перайсці ад аграрнай вытворчасці да індустрыяльнай. Беларусь мае патрэбу ў энерганосьбітах, ёй таксама неабходна прадаваць сваю прадукцыю, гэта краіна-экспарцёр. «Са свайго боку мы выдзяляем Беларусі радовішчы нафты і газу. Ствараюцца сумесныя прадпрыемствы па зборцы трактароў і іншай тэхнікі. Мы пастаўляем на беларускі рынак каву, а ў перспектыве будзем пастаўляць какаву і, магчыма, нейкія паўфабрыкаты. Дарэчы, гэта самая лепшая ў свеце какава, — не без гонару зазначыў пасол. — Гэта прызнана нават швейцарцамі. Так што вы зможаце палепшыць свой рацыён за кошт шакаладу». Кіраўнік дыпмісіі нагадаў таксама пра тое, што Венесуэла закупляе ў Беларусі сухое малако і іншыя прадукты харчавання ў дастаткова вялікай колькасці.

Двухбаковыя адносіны не абмяжоўваюцца выключна эканамічным супрацоўніцтвам. Заключаныя пагадненні аб супрацоўніцтве ў навукова-даследчай сферы. «І размова тут не ідзе аб ваенных пагадненнях, — паспяшаўся засцерагчы журналістаў ад здагадак пасол. Мы не закупляем у Беларусі ўзбраенне».

Бясплатныя ўрокі іспанскай... Вы, відаць, думаеце, што ў казцы? Але ж не, у Лацінаамерыканскім культурным цэнтры імя Сімона Балівара ў Мінску па вуліцы Пуліхава, 31. Апроч іспанскай мовы, беларусы змогуць авалодаць і адмысловым танцавальным майстэрствам. Культурны цэнтр прапануе заняткі па лацінаамерыканскіх нацыянальных танцах. Колькасць месцаў, зразумела, абмежаваная, таму варта загадзя запісвацца. Аматарам лацінаамерыканскай культуры таксама будуць дэманстраваць венесуэльскае кіно, з 1 кастрычніка пачнуцца штотыднёвыя паказы — паведаміў дырэктар цэнтра Херарда Эстрада. А 25 кастрычніка ў Беларусі ўпершыню выступіць Венесуэльскі тэатр (у рамках міжнароднага фестывалю «Панарама»).

Днямі пасол асабіста сустрэўся з венесуэльскай прыгажуняй, якая будзе прадстаўніцай сваёй радзімы на конкурсе «Інтэркантынентальный-2009» у Мінску. Ён лічыць, што ў зямлячкі вельмі высокія шанцы на перамогу, «хоць на конкурсе шмат прыгожых дзяўчат — і беларуска, і полька». Аднак, натуральна, гэта пытанне ў кампетэнцыі журы конкурсу і гледачоў. «Прыгажосць, як грыб — яе нельга схаваць. Ва ўладзе гледачоў вырашыць, аднак мы лічым, што венесуэльская ўдзельніца — вельмі прыгожая, вельмі разумная і годна прадстаўляе жаночую палову. Мы абавязкова пойдзем на конкурс, каб падтрымаць яе ў гэты дзень», — заявіў дыпламат.

Адказваючы на пытанні журналістаў пра венесуэльскія крэдыты Беларусі, кіраўнік дыпмісіі запэўніў:

— Венесуэла заўжды гатова дапамагаць братняму народу Беларусі. Ва ўмовах крызісу церпіць найперш не ўрад, а народ. Венесуэла дапамагала і гатова дапамагаць фінансава Беларусі.

А ў дачыненні да абхаза-асецінскага пытання (дарэчы, Венесуэла прызнала незалежнасць дзвюх каўказскіх рэспублік) выказаўся так:

— Кожная дзяржава мае суверэннае права прызнаваць або не прызнаваць суверэннасць іншых краін, не ўплываючы на меркаванне іншых.

**Зоя ВАРАНЦОВА.**

## СТВАРЭННЕ СУДА ПРЫСЯЖНЫХ У БЕЛАРУСІ ПАКУЛЬ НЕ ПЛАНУЕЦЦА

Аб гэтым паведаміў журналістам намеснік старшыні Вярхоўнага суда Беларусі Валерый Калінковіч. «Мы ніколі не захапляліся рэформамі дзеля рэформаў», — падкрэсліў намеснік старшыні.

**БЕЛТА.**


**АУКЦИОН**

**ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «ЗЕНИТ – БЕЛОМО»**
**КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»**

**ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже следующих зданий (цены снижены на 20 %): **Лот № 1:** здание специализированное розничной торговли (пристройка к дому), об. пл. 1576,5 кв.м, **г. Вилейка, ул. Чапаева, 60. Начальная цена с НДС – 606 943 064 бел. руб.** Задаток – 35 000 000 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,1007 га. **Лот № 2:** здания специализированные складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ – здание склада ЛВЖ, об. пл. 684,9 кв.м, здание кислотного склада, об. пл. 196,5 кв.м, **г. Вилейка, ул. Красина. Начальная цена с НДС – 1 353 830 110 бел. руб.** Задаток – 50 000 000 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,4619 га, имеется ж/д ветка. **Лот № 3:** здание специализированное для производства электротехнического, электронного и оптического оборудования (производственный корпус № 7 с АБК), об. пл. 19605,9 кв.м, **г. Вилейка, ул. Чапаева, 26. Начальная цена с НДС – 8 834 828 268 бел. руб.** Задаток – 100 000 000 бел. руб. Земельный участок для обслуживания данного здания будет выделен из земельного участка об. пл. 10,3339 га, находящегося в постоянном пользовании ОАО «Зенит – БелОМО». Задаток перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 дней после проведения аукциона. **Оплата за объект производится в следующем порядке: 50 % стоимости объекта оплачивается в течение 10 дней с даты подписания договора купли-продажи, оставшиеся 50 % – в течение 30 дней с даты подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором.** Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **02.10.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **01.10.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**
**Сайт в интернете: www.rlt.by.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**ПО ПОРУЧЕНИЮ ЧПУП «СТАРОДОРОЖСКИЙ КООППРОМ» (ПРОДАВЕЦ)**
**КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже объектов недвижимости, расположенных по адресу: Минская область, Стародорожский район, д. Новины, в составе: **Лот № 1:** здание откормочного пункта КРС, об. пл. 938,8 кв.м. Начальная цена с НДС – 76 195 500 бел. руб. **Лот № 2**: здание свиноткормочного пункта, об. пл. 1096,8 кв.м. Начальная цена с НДС – 79 939 100 бел. руб. **Лот № 3:** здание свинарника-маточника, об. пл. 525,2 кв.м. Начальная цена с НДС – 48 583 200 бел. руб. **Лот № 4:** здание кормоцеха, об. пл. 136 кв.м. Начальная цена с НДС – 11 189 000 бел. руб. Земельные участки для обслуживания объектов недвижимости будут выделены из земельного участка об. пл. 69,04 га, находящегося в постоянном пользовании продавца. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **27.10.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **26.10.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**
**Сайт в интернете: www.rlt.by.**


## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### АБАМА І МЯДЗВЕДЗЕЎ АЦАНІЛІ СВАЕ АДНОСІНЫ



**Прэзідэнты Расіі і ЗША Дзмітрый Мядзведзеў і Барак Абама заяўляюць, што ў іх склаліся канструктыўныя ўзаемаадносіны, якія дазваляюць абмяркоўваць і вырашаць самыя надзённыя праблемы дзвюх краін.**

Асноўнымі тэмамі для абмеркавання на сустрэчы двух лідараў сталі супрацьракетная абарона і новая дамова аб скарачэнні стратэгічных наступальных узбраенняў. Прэзідэнт Расіі заявіў свайму амерыканскаму калегу, што лічыць вельмі разумнымі апошнія рашэнні ЗША па адмове ад ПРА ва Усходняй Еўропе. Што датычыцца новай расійска-амерыканскай дамовы аб стратэгічных наступальных узбраеннях, праца па іх падрыхтоўцы ідзе канструктыўна, адзначыў Мядзведзеў. Акрамя таго, Расія і ЗША выступаюць за дыпламатычнае ўрэгуляванне іранскай ядзернай праблемы. Аднак у тым выпадку, калі Тэгеран не пойдзе насустрач, размова будзе ісці аб санкцыях, заявіў амерыканскі лідар.

### У ШВЕЦЫІ ВЫКРАЛІ МІЛЬЯРД

**Рэкорднае рабаванне ўзрушыла Стакгольм дзёрзкасцю злачынцаў і іх падрыхтоўкай. Усяго за 20 хвілін рабаўнікі на верталёце выкралі са сховішча мільярд крон. Гэта так шмат, што зараз жыхары сталіцы Швецыі сутыкнуцца з недахопам наяўнасці.**

Злачынцы абрабавалі сховішча каштоўных папер у Стакгольме, якое належыць найбуйнейшай у Швецыі інкасатарскай фірме G4S. Кіраўніцтва пацярпелай кампаніі адмаўляецца назваць нават прыблізную суму выкрадзенага, але, па словах прадстаўніка Гандлёвай арганізацыі Швецыі, гаворка ідзе аб мільярдзе крон (89 млн фунтаў стэрлінгаў). Злачынцы селі на будынак у белым верталёце. З яго выскачылі некалькі ўзброеных аўтаматамі людзей у масках, залезлі ў аперацыйную залу, дзе некалькі дзясяткаў супрацоўнікаў займаліся падлікам грошай. Злачынцы з дапамогай выбухоўкі ўзламалі сейфы з грашыма, а затым паднялі сваю здабычу з дапамогай вяровак на дах. Ніхто з супрацоўнікаў G4S не пацярпеў, хоць сведкамі налёту стаў 21 чалавек. Рабаванне было здзейснена ў імклівым рэжыме — злачынцы справіліся за 20 хвілін. Усе дзеянні паліцыі вынікаў не прынеслі. Толькі праз некалькі гадзін кінуты верталёт злачынцаў быў знойдзены ў паўночным прыгарадзе Стакгольма.



### У ІНДАНЭЗІІ НАРАДЗІЛАСЯ 9-КІЛАГРАМОВАЕ ДЗІЦЯ

**На поўначы інданэзійскага вострава Суматра на свет з'явілася адно з самых буйных немаўлят у свеце. Вага дзіцяці складае амаль дзевяць кілаграмаў пры росце ў 62 сантыметры.**

41-гадовай маці давялося рабіць кесарава сячэнне, у жанчыны гэта ўжо чацвёртае дзіця. Па меркаванні дактароў, велізарная вага дзіцяці тлумачыцца цукровым дыябетам, на які хварэе яго маці. Тым не менш немаўля нарадзілася абсалютна здаровым.

### ЧАТЫРЫ МЕСЯЦЫ З НАЖОМ У ЯГАДЗІЦАХ

**На 26-гадовую жыхарку Кітая Ін Шы быў здзейснены разбойны напад. Адзін са злачынцаў ударыў кітаянку нажом у ягадзіцу.**

Пасля таго, як жанчына звярнулася па медыцынскую дапамогу, урачы некаторы час не маглі вызначыць прычыну яе скаргаў на болі ў вобласці жывата. У выніку рэнтгеналагічнага даследавання медыкі высветлілі, што боль быў выкліканы ціскам металічнага прадмета на мачавы пузыр. Даўжыня ляза, якое захраснула ў целе, склала каля 15 сантыметраў, знаходзілася яно ў целе больш за чатыры месяцы.


ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.09.2009 г. (для б/н разлікаў)

| | |
|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 2 754,00 |
| ▼ 1 еўра | 4 065,45 |
| 1 латвійскі лат | 5 745,28 |
| 1 літоўскі літ | 1 175,82 |
| 1 чэшская крона | 161,14 |
| 1 польскі злоты | 968,34 |
| ▼ 1 расійскі рубель | 91,59 |
| 1 украінская грыўня | 322,86 |

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РБ

| | |
|---|---|
| USD | 30,0678 |
| UAH | 35,2495 |
| 1000 BYR | 10,9020 |
| EUR | 44,3620 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

*Закон Рэспублікі Беларусь*

# АБ ПАРАДКУ ВЫЕЗДУ З РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ І ЎЕЗДУ Ў РЭСПУБЛІКУ БЕЛАРУСЬ ГРАМАДЗЯН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрвеня 2009 года*
*Ухвалены Саветам Рэспублікі 30 чэрвеня 2009 года*

Гэты Закон накіраваны на забеспячэнне канстытуцыйнага права грамадзян Рэспублікі Беларусь (калі не вызначана іншае, далей — грамадзяне) свабодна пакідаць Рэспубліку Беларусь і бесперашкодна вяртацца назад.

**ГЛАВА 1**
**АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

**Артыкул 1. Сфера дзеяння гэтага Закона**

Гэты Закон рэгулюе праваадносіны, якія ўзнікаюць у сувязі з выездам з Рэспублікі Беларусь і ўездам у Рэспубліку Беларусь грамадзян, вызначае агульныя правілы выезду з Рэспублікі Беларусь і ўезду ў Рэспубліку Беларусь грамадзян, у тым ліку падставы і парадак часовага абмежавання права грамадзян на выезд з Рэспублікі Беларусь, і асаблівасці выезду з Рэспублікі Беларусь асобных катэгорый грамадзян, а таксама вызначае агульныя пытанні афармлення пастаяннага пражывання грамадзян за межамі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 2. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб парадку выезду з Рэспублікі Беларусь і ўезду ў Рэспубліку Беларусь грамадзян**

Заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб парадку выезду з Рэспублікі Беларусь і ўезду ў Рэспубліку Беларусь грамадзян грунтуецца на Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і складаецца з гэтага Закона, іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь, у тым ліку міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь.

Калі міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь вызначаныя іншыя правілы, чым тыя, якія змяшчаюцца ў гэтым Законе, то прымяняюцца правілы міжнароднага дагавора.

**Артыкул 3. Права грамадзян на выезд з Рэспублікі Беларусь і ўезд у Рэспубліку Беларусь**

Кожны грамадзянін мае права выязджаць з Рэспублікі Беларусь і ўязджаць у Рэспубліку Беларусь.

Грамадзянін не можа быць пазбаўлены права на выезд з Рэспублікі Беларусь і права на ўезд у Рэспубліку Беларусь.

Права грамадзяніна на выезд з Рэспублікі Беларусь можа быць часова абмежавана ў адпаведнасці з гэтым Законам і іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь у інтарэсах нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, аховы маралі, здароўя насельніцтва, правоў і свабод іншых асобаў.

Права грамадзяніна на ўезд у Рэспубліку Беларусь не можа быць абмежавана.

**Артыкул 4. Права грамадзян на абарону і апеку Рэспублікі Беларусь**

Грамадзянам гарантуецца абарона і апека Рэспублікі Беларусь за межамі Рэспублікі Беларусь.

Дыпламатычныя прадстаўніцтвы і консульскія ўстановы Рэспублікі Беларусь абавязаны прымаць меры па абароне правоў і законных інтарэсаў грамадзян, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь, і апекавацца імі ў парадку, што вызначаецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, у тым ліку міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

У выпадку, калі ў дзяржаве знаходжання грамадзян адсутнічаюць дыпламатычныя прадстаўніцтвы і консульскія ўстановы Рэспублікі Беларусь, абарона правоў і законных інтарэсаў грамадзян у адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь можа ажыццяўляцца адпаведнымі органамі іншых замежных дзяржаў.

У выпадку, калі ў замежнай дзяржаве ўзнікае надзвычайная сітуацыя, Рэспубліка Беларусь гарантуе прыняцце дыпламатычных і іншых прадугледжаных міжнародным правам мераў па забеспячэнні бяспекі грамадзян, якія знаходзяцца на тэрыторыі гэтай замежнай дзяржавы.

У выпадку, калі ў замежнай дзяржаве ўзнікаюць абставіны, якія ўскладняюць прыняцце мераў па абароне правоў і законных інтарэсаў грамадзян і апеку з боку Рэспублікі Беларусь, Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь прымае меры па давядзенні да ведама грамадзян рэкамендацый аб непажаданасці ўезду ў гэту замежную дзяржаву. Такія рэкамендацыі не з'яўляюцца падставай для часовага абмежавання права грамадзян на выезд з Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 5. Недапушчальнасць абмежавання правоў грамадзян у сувязі з афармленнем пастаяннага пражывання за межамі Рэспублікі Беларусь або пастаянным пражываннем за межамі Рэспублікі Беларусь**

Грамадзяне, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь, а таксама грамадзяне, якія заявілі аб сваім жаданні аформіць пастаяннае пражыванне за межамі Рэспублікі Беларусь, карыстаюцца ўсімі правамі і свабодамі і выконваюць абавязкі нароўні з грамадзянамі, якія пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, калі іншае не вызначана заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

**ГЛАВА 2**
**АГУЛЬНЫЯ ПРАВІЛЫ ВЫЕЗДУ З РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ І ЎЕЗДУ Ў РЭСПУБЛІКУ БЕЛАРУСЬ ГРАМАДЗЯН. ЧАСОВАЕ АБМЕЖАВАННЕ ПРАВА ГРАМАДЗЯН НА ВЫЕЗД З РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**Артыкул 6. Дакументы для выезду з Рэспублікі Беларусь і ўезду ў Рэспубліку Беларусь**

Грамадзяне выязджаюць з Рэспублікі Беларусь і ўязджаюць у Рэспубліку Беларусь па наступных сапраўдных дакументах:

пашпарце грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;

дыпламатычным пашпарце грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;

службовым пашпарце грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;

нацыянальным пасведчанні асобы марака Рэспублікі Беларусь.

Аднаразовы ўезд грамадзян у Рэспубліку Беларусь можа ажыццяўляцца па пасведчанні на вяртанне ў Рэспубліку Беларусь.

Парадак выдачы, выкарыстання, абмену, прызнання несапраўднымі, канфіскацыі, захоўвання і знішчэння дакументаў для выезду з Рэспублікі Беларусь і (або) уезду ў Рэспубліку Беларусь вызначаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 7. Падставы для часовага абмежавання права грамадзян на выезд з Рэспублікі Беларусь**

Права грамадзяніна на выезд з Рэспублікі Беларусь можа быць часова абмежавана, калі:

ён ведае звесткі, якія складаюць дзяржаўную тайну, — да заканчэння тэрміну, вызначанага ў дагаворы аб допуску да дзяржаўных сакрэтаў;

ён з'яўляецца падазроным або абвінавачваным па крымінальнай справе, — на тэрмін, які вызначаны органам крымінальнага пераследу, але не больш чым да спынення крымінальнага пераследу альбо да ўваходжання прыгавору суда ў законную сілу;

ён асуджаны за ўчыненне злачынства, за выключэннем асуджаных без прызначэння пакарання або да пакарання ў выглядзе пазбаўлення права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю, — на тэрмін, вызначаны органам або ўстановай, якая выконвае пакаранне або іншыя меры крымінальнай адказнасці, але не больш чым да адбыцця пакарання або вызвалення ад пакарання альбо да заканчэння тэрміну адтэрмінавання выканання пакарання або выпрабавальнага тэрміну;

за ім устаноўлены прэвентыўны нагляд, — да спынення прэвентыўнага нагляду;

ён не выконвае без уважлівых прычын маёмасныя, падатковыя або іншыя абавязацельствы перад Рэспублікай Беларусь, яе адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі, фізічнымі і юрыдычнымі асобамі, вызначаныя судовымі пастановамі, якія ўвайшлі ў законную сілу, або выканаўчымі дакументамі, — на тэрмін, вызначаны судом, але не больш чым да выканання абавязацельстваў;

яму прад'яўлены грамадзянскі іск у судзе, — на тэрмін, вызначаны судом, але не больш чым да заканчэння вытворчасці па справе;

ён з'яўляецца даўжніком па справе аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве) або зацікаўленай асобай у дачыненні да даўжніка — юрыдычнай асобы, — з моманту адкрыцця конкурснай вытворчасці на тэрмін, вызначаны судом, але не больш чым да заканчэння вытворчасці па справе аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве);

ён ухіляецца ад яўкі на мерапрыемствы па прызыве на ваенную службу, службу ў рэзерве, — да яўкі на мерапрыемствы па прызыве на ваенную службу, службу ў рэзерве.

**Артыкул 8. Дзяржаўныя органы Рэспублікі Беларусь і іншыя юрыдычныя асобы, якія прымаюць рашэнні аб часовым абмежаванні права грамадзян на выезд з Рэспублікі Беларусь**

Рашэнні аб часовым абмежаванні права грамадзян на выезд з Рэспублікі Беларусь прымаюцца:

дзяржаўнымі органамі Рэспублікі Беларусь і іншымі юрыдычнымі асобамі, якія заключылі з грамадзянамі дагаворы аб допуску да дзяржаўных сакрэтаў, — у дачыненні да грамадзян, якія ведаюць звесткі, што складаюць дзяржаўную тайну;

органамі крымінальнага пераследу — у дачыненні да грамадзян, які падазраюцца або абвінавачваюцца па крымінальных справах;

органамі і ўстановамі, якія ажыццяўляюць пакаранне або іншыя меры крымінальнай адказнасці, — у дачыненні да грамадзян, асуджаных за ўчыненне злачынства;

судамі — у дачыненні да грамадзян:

за якімі ўстаноўлены прэвентыўны нагляд;

якія не выконваюць без уважлівых прычын маёмасныя, падатковыя або іншыя абавязацельствы перад Рэспублікай Беларусь, яе адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі, фізічнымі і юрыдычнымі асобамі, вызначаныя судовымі пастановамі, якія ўвайшлі ў законную сілу, або выканаўчымі дакументамі;

якім прад'яўлены грамадзянскі іск у судзе;

якія з'яўляюцца даўжнікамі па справах аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве) або зацікаўленымі асобамі ў дачыненні да даўжніка — юрыдычнай асобы;

ваеннымі камісарыятамі — у дачыненні да грамадзян, якія ўхіляюцца ад яўкі на мерапрыемствы па прызыве на ваенную службу, службу ў рэзерве.

*(Заканчэнне ў наступным нумары.)*

## Спорт-тайм

### БІЛЕТЫ НА «БАТЭ—«ЭВЕРТАН» — У ПРОДАЖЫ

Сёння ў касах сталічнага стадыёна «Дынама» і барысаўскага гарадскога стадыёна з'явіцца ў продажы білеты на матч другога тура групавога раўнда Лігі Еўропы паміж барысаўскім клубам БАТЭ і ліверпульскім «Эвертанам». Матч пройдзе 1 кастрычніка ў Мінску. Касы адчыняюцца ў 10 гадзін раніцы ў Мінску і ў Барысаве. У адны рукі, як і летась на матчы Лігі чэмпіёнаў, больш за 4 білеты не прадаюць.

Білеты, як паведамляе прэс-служба БАТЭ, падзеленыя на тры катэгорыі: 1-я — 40 тысяч рублёў, 2-я — 25 тысяч і 3-я — 10 тысяч.

### «ДЫНАМА» ЗАМАЦАВАЛАСЯ НА ДРУГІМ РАДКУ

У сераду прайшлі матчы 20-га тура чэмпіянату краіны па футболе ў вышэйшай лізе. Сталічнае «Дынама» перамагло 1:0 на сваім полі мікашэвіцкі «Граніт» і замацавала за сабой другі радок турнірнай таблицы. Яго канкурэнты ў барацьбе за другое месца ў туры страцілі ачкі. Другую перамогу запар атрымаў сталічны МТЗ-РІПА, які змагаецца за выжыванне ў вышэйшай лізе. На гэты раз сталічная дружына ўзяла верх над адным з лідараў, магілёўскім «Дняпром» — 1:0. Жодзінскае «Тарпеда» разграміла «Гомель» — 4:0, аўтсайдар чэмпіянату «Смаргонь» не саступіла аднаму з лідараў, наваполацкаму «Нафтану» — 2:2, «Мінск» і «Шахцёр» таксама згулялі ўнічыю — 1:1. «Брэсцкае «Дынама» перайграла «Нёман» — 2:0. Учора ўвечары адбыўся апошні матч тура паміж барысаўскім БАТЭ і «Віцебскам».

Становішча камандаў: БАТЭ — 44 ачкі, «Дынама» (Мн) — 37, «Днепр» — 32, «Нафтан» — 32, «Тарпеда» — 31, «Шахцёр» — 29, «Дынама» (Бр) — 28, «Нёман» — 27, «Гомель» — 25, «Мінск» — 24, «Віцебск» — 22, МТЗ-РІПА — 22, «Граніт» — 21, «Смаргонь» — 10. БАТЭ згуляў 18 матчаў, «Смаргонь» і «Віцебск» — па 19, астатнія каманды — па 20.


**РУП «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 28 октября 2009 г. в 15.00 по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54, состоится АУКЦИОН по продаже недвижимого имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «Белшина», в составе следующих лотов:**

| Лот № 1 | Лот № 2 |
|---|---|
| **Комплекс зданий и сооружений, расположенный по адресу: г. Бобруйск, ул. Гагарина, 35, в составе:** | **Незавершенный строительством комплекс зданий и сооружений, расположенный по адресу: г. Бобруйск, ул. Энергетиков, 5, в составе:** |
| капитальное строение с инв № 710/С-55984 (одноэт, кирп. здание склада многоцелевого назнач. № 1) пл. 268,7 кв.м; | незавершенное законсервир. кап.строение с инв № 710/С-3795 (административно-бытовой корпус) пл. 1941,8 кв.м; |
| капитальное строение с инв № 710/С-55980 (одноэт, кирп. здание склада многоцелевого назнач. № 2) пл. 268,7 кв.м; | незавершенное законсервир. кап. строение с инв № 710/С-3797 (вспомогательный корпус) пл. 2776,3 кв.м; |
| капитальное строение с инв № 710/С-55981 (одноэт, кирпич. здание склада стройматериалов) общ. пл. 222,1 кв.м; | незавершенное законсервир. кап.строение с инв № 710/С-3796 (производственный корпус) пл. 5386 кв.м; |
| капитальное строение с инв № 710/С-55979 (двухэт, кирп. здание проходной) пл. 21,9 кв.м; | незавершенное законсервир. кап. строение с инв № 710/С-3798 (заправка) пл. 87 кв.м; |
| капитальное строение с инв № 710/С-55974 (одноэт, кирп. здание пилорамы) общ. пл. 197,3 кв.м; | незавершенное кап. строение (очистное сооружение литер 5Б) пл. 14,67 кв.м; |
| капитальное строение с инв № 710/С-55983 (одноэт, из ж/б плит здание склада с пристройкой) пл. 89,8 кв.м; | незавершенное кап. строение (очистное сооружение литер 4Б) пл. 14,78 кв.м; |
| капитальное строение с инв № 710/С-55982 (двухэт, кирп. здание мастерских с участком деревообработки, складом, двумя пристройками) общ. пл. 1070,6 кв.м; | ограждение ж/бет. площадью 2244 кв.м. с воротами металлическими площадью 12,6 кв.м; |
| капитальное строение с инв № 710/С-53567 (склад базы СРСУ) общ. пл. 69,8 кв.м; | незавершенные строительством сооружения: покрытие бет. пл. 2550 кв.м, резервуары установки пожаротушения пл. 32,5 кв.м, грязеуловители, внутриплощадочные тепл. сети |
| капитальное строение с инв № 710/С-53574 (площадка хранения) пл. 533 кв.м; | |
| капитальное строение с инв № 710/С-53576 (площадка пилорамы) пл. 237 кв.м; | |
| капитальное строение с инв № 710/С-53568 (навес участка металлоконструкций) пл. 154,1 кв.м; | |
| капитальное строение с инв № 710/С-53575 (покрытие а/б базы СРСУ) пл. 11492 кв.м; | |
| капитальное строение с инв № 710/С-53573 (эстакада ж/б базы СРСУ) пл. 40 кв.м; | |
| капитальное строение с инв № 710/С-53577 (ограждение базы ж/б с воротами) протяженностью 486,72 м; | |
| капитальное строение с инв № 710/С-53571 (электросети базы СРСУ) протяженностью 103,3 м; | |
| капитальное строение с инв № 710/С-53569 (тепловые сети базы СРСУ) протяженностью 19,6 м; | |
| капитальное строение с инв № 710/С-53572 (сети хозпитьевого водопровода базы СРСУ) протяженностью 144,4 м; | |
| капитальное строение с инв № 710/С-53570 (сети хозфекальной канализации базы СРСУ) протяженностью 19,25 м | |

| | Лот № 1 | Лот № 2 |
|---|---|---|
| **Общие сведения** | | |
| **Организатор торгов** | **РУП «Белтехинвентаризация», г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54, УНП 190305149** | |
| **Начальная цена продажи, рублей без НДС** | **578 702 461** | **6 869 370 627** |
| **Размер задатка, рублей** | **28 935 120** | **343 468 530** |
| **Номер расчетного счета для перечисления задатка** | **Получатель платежа ОАО «Белшина» – р/с 3012000003446 в ОАО СБ «Беларусбанк» г. Бобруйска, код 760, УНП 700016217, ОКПО 147621337000** | |
| **Площадь земельного участка** | **4,0721 га,** кадастровый номер 741000000003000056, правовой режим – право постоянного пользования | **5,9884 га**, правовой режим – право постоянного пользования |
| **Характеристика объектов** | здание склада № 1 – фундамент бут., перекрытия отсут., полы бетон. здание склада № 2 – фундамент бут., перекрытия отсут., полы бетон; здание склада стройматериалов – фундамент бут., перекрытие ж/бет., полы бетон.; здание проходной – фундамент бут., перекрытия ж/бет.; здание пилорамы – фундамент бут., перекрытия ж/бет., полы бетон., дощатые; здание склада с пристройкой – фундамент бут., перекрытия ж/бет., полы бетон.; здание мастерских с участком деревообработки, складом, двумя пристройками – фундамент бут., перекрытия ж/бет., полы бетон. склад базы СРСУ – фундамент бет., перекрытия ж/бет., полы бетон.; площадка хранения – из ж/бет. плит; площадка пилорамы – бетонная; навес участка металлоконструкций – фундамент бутовый, стены – панели и кирп., перекрытия отсут., полы бетон. | здание адм.-быт. корп. – 3-эт. панельное, частич. кирпич, фундамент ж/б, перекрытия ж/б, степень гот. – 42,6 %; здание вспомогат. корп. – 1-эт. панельное, частич. кирпич, фундамент ж/б, перекрытия ж/б, степень гот. – 55,6 %; здание производственного корпуса – 1-эт. панельное, частич. кирпич, фундамент ж/б, перекрытия ж/б, степень гот. – 62,5 %; заправка – фундамент ж/б, стены кирп., перекрытия отсут., степень гот. – 48 %; очистное сооружение литер 5Б – степень гот. – 81 %; очистное сооружение литер 4Б – степень гот. – 81 %; ограждение с воротами – степень гот. – 100 %; покрытие – степень гот. – 10 %; резервуары установки пожаротушения – фундамент монолит. ж/б, стены кирп., степень гот. – 15 %. |
| **Условия продажи** | аукцион без условий | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | в течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов | |
| **Условия оплаты** | определяются по согласованию Победителя торгов с Собственником имущества при заключении договора купли-продажи | |
| **Срок подачи документов, осмотра объектов и внесения задатка** | **по 27 октября 2009 г. включительно** | |

**Для участия в аукционе в адрес Организатора торгов необходимо предоставить:** заявление на участие; заверенную банком копию платежного поручения о внесении размера задатка, паспорт; **для резидентов Республики Беларусь: юр. лицам** – доверенность представителю юр. лица (в случае необходимости таковой), копии и оригиналы учредительных документов и свидетельства о гос. регистрации; **представителям физ. лиц** – нотариально заверенную доверенность; **для нерезидентов Республики Беларусь: юр. лицам** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена не ранее чем за 6 мес. до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; **юр. лицам и физ. лицам** – документ о состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на бел. (рус.) язык; представителям юр. и физ. лиц – легализованную в установленном порядке доверенность.

**Выигравшим торги на аукционе признается лицо, предложившее наиболее высокую цену.** Задаток, внесенный Победителем, будет зачтен в счет окончательной стоимости приобретенного имущества, остальным участникам будет возмещен в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. **Организатор торгов или Продавец вправе снять объект с торгов до объявления его проданным.**

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляет Победитель (Претендент на покупку) не позднее 3 раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона на основании счет-фактуры, выдаваемой Организатором торгов до проведения аукциона.

**Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 52 08 45, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.**



Минский городской центр недвижимости

**УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»**

**(организатор аукциона) 09 октября 2009 года повторно проводит открытый аукцион по продаже зданий, сооружений и иного имущества, находящегося в собственности ОАО «Белпромтара» (продавец)**

**На аукционные торги выставляются:**

| Номер лота | № 1 | № 2 | № 3 | № 4 |
|---|---|---|---|---|
| **Наименование и характеристики имущества, входящего в состав лота** | - Здание конторы, инв. номер 630/С-42877, площадь – 278,8 кв.м;<br>- здание котельной с сушилкой, инв. номер 630/С-42872, площадь – 170,0 кв.м;<br>- здание цеха новой тары, инв. номер 630/С-42874, площадь – 476,4 кв.м;<br>- здание склада хранения тары, инв. номер 630/С-42875, площадь – 993,0 кв.м;<br>- здание гаража, инв. номер 630/С-42876, площадь – 318,9 кв.м;<br>- здание склада хранения тары, инв. номер 630/С-42879, площадь – 655,9 кв.м;<br>- здание лесопильного цеха, инв. номер 630/С-42855, площадь – 481,7 кв.м;<br>- здание производственного цеха тары, инв. номер 630/С-42869, площадь – 597,7 кв.м;<br>- асфальтовое покрытие, инв. номер 630/С-50723, площадь – 6199,8 кв.м;<br>- водоем пожарный, инв. номер 630/С-50720; объем – 158,4 куб. м, диаметр – 7,0 м, глубина – 3,6 м;<br>- участок водопроводной сети, инв. номер 630/С-50721, протяженность – 159,5 м;<br>- линия электропередач, инв. номер 630/С-50726, протяженность – 656 м;<br>- насаждения производственных площадей инв. номер 051/09 | - Контора с пристройкой, инв. номер 631/С-8478, площадь – 104,6 кв.м;<br>- навес хранения тары, инв. номер 631/С-8416, площадь – 517,3 кв.м;<br>- цех ремонта картонной тары, инв. номер 631/С-8418, площадь – 321,0 кв.м;<br>- здание гаража с пристройкой, инв. номер 631/С-8419, площадь –149,4 кв.м;<br>- цех тарный, инв. номер 631/С-8422, площадь – 57,3 кв.м;<br>- склад хранения тары, инв. номер 631/С-8424, площадь – 610,0 кв.м;<br>- цех новой тары, инв. номер 631/С-8454, площадь – 252,5 кв. м;<br>- ленкомната, инв. номер 631/С- 8459, площадь – 61,8 кв. м;<br>- линия электропередач, инв. номер 631/С-12634, протяженность – 179,5 м;<br>- водоем пожарный, инв. номер 631/С-12636, объем – 8,0 куб. м, диаметр – 2,0 м, глубина – 2,5 м;<br>- насаждения производственных площадей, инв. номер 053/09 | - Административное здание (в том числе: уборная, ограждение, ворота металлические, ворота металлические, забор деревянный, колодец ж/б), инв. номер 443/С-1626, площадь – 82,0 кв. м;<br>- склад тары №1, инв. номер 443/С-1627, площадь – 99,6 кв. м;<br>- склад тары № 2, инв. номер 443/С-1628, площадь – 98,6 кв.м;<br>- склад прочей тары, инв. номер 443/С-1629, площадь – 973,4 кв.м;<br>- навес для хранения тары, инв. номер 443/С-1630, площадь – 412,6 кв.м;<br>- насаждения производственных площадей, инв. номер 052/09 | - Здание конторы (в том числе: беседка, беседка, уборная, забор, ворота, калитка), инв. номер 450/С-5923, площадь – 54,1 кв. м;<br>- производственный цех, инв. номер 450/С-5926, площадь – 1220,9 кв.м;<br>- асфальтобетонное покрытие, инв. номер 450/С-20691, площадь – 1091,1 кв.м;<br>- канализационный выпуск, инв. номер 450/С-20693;<br>- водопроводный ввод, инв. номер 450/С-20694;<br>- сеть электроснабжения, инв. номер 450/С-20695,<br>- зеленые насаждения |
| **Местонахождение имущества** | Минская область, г. Молодечно, ул. Либаво-Роменская, д. 54 | Минская область, г. Вилейка, ул. Шубина, д. 41 | Гродненская область, г. Сморгонь, ул. Железнодорожная, д. 7 | Гродненская область, г. Слоним, ул. Железнодорожная, д. 3 |
| **Сведения о земельном участке** | площадь – 2,6213 га, кадастровый номер 642000000003001231; площадь – 0,1816 га, кадастровый номер 642000000003001230, назначение – содержание и обслуживание зданий и сооружений | площадь – 1,0695 га, кадастровый номер 621350100007001681, назначение – обслуживание зданий и сооружений | площадь – 0,9336 га, кадастровый номер 425650100001000935, назначение – размещение производственной базы | площадь – 0,5614 га, кадастровый номер 425450100001001503, назначение – обслуживание зданий и сооружений |
| **Начальная цена с учетом НДС** | 1 462 773 194 белорусских рубля | 563 204 560 белорусских рублей | 363 392 918 белорусских рублей | 368 372 011 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 140 000 000 белорусских рублей | 50 000 000 белорусских рублей | 30 000 000 белорусских рублей | 30 000 000 белорусских рублей |
| **Обременение договорами аренды:номер, дата (срок действия)** | № 9/07 от 01.12.2008 (по 30.10.2009) | № 2/08 от 15.02.2008 (по 14.02.2013) | | № 4/08 от 01.01.2009 (по 30.11.2009) |

**К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:**

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект (лот). Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона заключается в течение 20 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта (лота) осуществляется в течение 30 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится **09 октября 2009 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с **28.09.2009 по 07.10.2009** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017)227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости»;**
**(017) 294 67 13, (8029) 636 15 22 – ОАО «Белпромтара».**
**Интернет: www.mgcn.by**



**НЕСВИЖСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА) 8 ОКТЯБРЯ 2009 г. в 10.00 ПО АДРЕСУ: г. НЕСВИЖ, ул. СОВЕТСКАЯ, 1**

**ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ АУКЦИОН**

на право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 624250100001003980 для установки и обслуживания торгового павильона по ул. Советская в г. Несвиже, площадью 0.0032 га. Срок аренды земельного участка – 51 год, арендодатель – Несвижский районный исполнительный комитет (далее – райисполком), Минская обл., г. Несвиж, ул. Советская, 1. Начальная цена права заключения договора аренды земельного участка – 167655 рублей, размер задатка – 16000 рублей.

Условия аукциона на право заключения договора аренды земельного участка: для установки и обслуживания торгового павильона; осуществление победителем аукциона в двухмесячный срок после принятия решения о предоставлении земельного участка государственной регистрации договора аренды земельного участка; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработка строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий шести месяцев; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; по окончании срока аренды земельного участка в установленном порядке решить вопрос о праве пользования этим участком.

Победитель обязан: подписать протокол о результатах аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия райисполкомом решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка внести в бюджет Несвижского района плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить расходы по публикации извещения о проведении аукциона, возместить расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией земельного участка в сумме 726118 рублей, после чего (но не позднее 2 рабочих дней) заключить договор аренды земельного участка с арендодателем.

Задаток перечисляется в срок по 7 октября 2009 г. на р\с 3642200070020 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код 523, г. Несвиж, УНП 600038472, получатель платежа – Несвижский районный исполнительный комитет.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Несвиж, ул. Советская, 1, к. 312, тел. **(8 01770) 54865.** Последний день подачи заявок – **7 октября 2009 г. до 17.00.** УНН 600038472.


### ДВОЙЧЫ ЗАГІНУЛЫ

У 5 гадзін 20 хвілін у вёсцы Лебядзёўка Жлобінскага раёна 40-гадовы мужчына, які спяшаўся на працу ў такі ранні і яшчэ цёмны час сутак, пераходзіў аўтадарогу Мінск—Гомель. Жыхара вёскі Кароткавічы, які не быў пазначаны флікерамі, спачатку збіў мікрааўтобус «Фальксваген». Мужчыну адкінула на сустрэчную паласу руху, дзе на яго ў той жа момант наехала «Аўдзі». Пешаход загінуў у выніку двайнога наезду.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## Абзац

◢ Навукоўцы Беларусі стварылі трансгенныя расліны бульбы, устойлівыя да калорадскага жука, заявіў у Мінску журналістам загадчык лабараторыі малекулярнай генетыкі Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі Мікалай Картэль. Цяпер праводзяцца лабараторныя выпрабаванні. У наступным годзе плануецца стварыць два ўчасткі для выпрабаванняў трансгеннай бульбы. Вядуцца распрацоўкі і па стварэнні трансгеннага рапсу.

◢ **У Мінску сям'я махляроў абдурыла 18 банкаў. З 2005 па 2007 год муж, жонка, сын і нявестка махлярскім шляхам атрымалі крэдыты на суму $15 тыс. і Br31 млн. Афера ўдавалася дзякуючы таму, што кожны раз пры запаўненні анкеты зламыснікі пісалі, што ў іх няма іншых крэдытаў. У міліцыі ад махінацыях сям'і даведаліся ад паручальнікаў, якія цяпер павінны аддаваць грошы банкам. Узбуджана крымінальная справа.**

◢ У Міёрскім раёне судовы выканаўца прысвойваў грошы. Са студзеня 2007 г. па сёлетні жнівень ён атрымаў ад грамадзян і арганізацый раёна Br27,7 млн у якасці выплат па рашэннях суда. Усе атрыманыя грошы ён прыўлашчваў. Узбуджана крымінальная справа. У ходзе папярэдняга расследавання малады чалавек вярнуў Br25,9 млн. Следства працягваецца.

◢ **Гомельскія памежнікі сумесна з супрацоўнікамі мытні ў цягніку Харкаў—Калінінград затрымалі 55 кантрабандных чарапах. Жывы тавар кантрабандысты везлі ў Калінінград з Украіны. Дакументаў, у тым ліку ад ветэрынара, на чарапах не было.**

◢ Судом Барысаўскага раёна асуджаны начальнік ізалятара часовага ўтрымання Жодзінскага ГУУС. Менавіта ён канваяваў Сяргея Багдашова, які збег з залы суда ў Жодзіне 29 мая і дагэтуль не знойдзены. Начальніку ІЧУ прызначана пакаранне ў выглядзе 4 гадоў абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу і пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады тэрмінам на 3 гады. Асуджаны прысуд не абскардзіў, і ён уступіў у сілу. Збеглы Багдашоў расшукваецца па лініі Інтэрпала.

◢ **З музея Брусэля скрадзеная карціна знакамітага мастака-сюррэаліста Рэне Магрыта. Кошт шэдэўра ацэньваецца ў 3 млн еўра. Карціна скрадзеная сярод белага дня двума ўзброенымі рабавальнікамі. Яна дэманстравалася на выставе, прысвечанай жыццю мастака.**

## Поўны абзац

◢ У Харкаве прайшла незвычайная акцыя пратэсту, якую аб'явілі журналісты газеты «Слобідський край», афіцыйнага друкаванага органа Харкаўскага аблсавета і абладміністрацыі. У нумары за аўторак на 8 палосах толькі два словы — «Акцыя пратэсту!» «Мы пяць месяцаў без зарплаты. Упершыню за 92 гады адзіная ў вобласці ўкраінскамоўная газета выйшла з пустымі старонкамі», — гавораць кіраўнікі рэдакцыі. Створана камісія, якая вывучае сітуацыю.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***


г. ВИТЕБСК 26.10.2009

**ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА**

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Неиспользуемое здание магазина № 43 с подвалом и сетью, расположенное по адресу: Витебская область, г. Орша, ул. Мира, 71, и право заключения договора аренды земельного участка. | Характеристика объекта недвижимости:<br>- капитальное строение с инвентарным номером 240/С-28

Заснавальнік — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 12 ад 19 лютага 2009 г.

25 ВЕРАСНЯ 2009 г. ПЯТНІЦА № 36 (15590)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

## «БЕЛПОШТА» ВЫЗНАЧАЕ ЛЕПШЫЯ КАДРЫ

**Ужо 13 гадоў збірае сваіх супрацоўнікаў «Белпошта» на Рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства. Сёлета ён праводзіцца сярод аператараў паштовай сувязі і паштальёнаў па дастаўцы паштовых адпраўленняў і друкаваных СМІ.**

У гэтым годзе конкурс прымеркаваны да Сусветнага дня пошты. Удзел у ім бяруць лепшыя з лепшых работнікі пошты з шасці абласных філіялаў «Белпошты» — пераможцы абласных этапаў спаборніцтва, а таксама філіяла горада Мінска. Працягнецца спаборніцтва 3 дні, падчас якіх удзельнікі змогуць не толькі абмяняцца вопытам і павысіць сваё майстэрства, але і праявіць свае творчыя здольнасці, паказаць веданне тэорыі сваёй прафесіі і практычныя навыкі. Штогод заданні і пытанні на конкурсе робяцца больш цікавымі і складанымі, дапамагаюць больш дакладна вызначыць прафесійнае майстэрства ўдзельнікаў.

2009 год у Беларусі абвешчаны Годам роднай зямлі, а ў межах СНД — Годам моладзі. Арганізатары конкурсу не абмінулі гэтыя дзве падзеі, і таму адным з конкурсаў стала творчая прэзентацыя «Жыву ў Беларусі, і тым ганаруся вачамі паштовай моладзі».

Пераможцы рэспубліканскага конкурсу атрымаюць дыпломы і каштоўныя падарункі ад «Белпошты».

**Ганна ЦАР.**

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ»

**АБ'ЯЎЛЯЕ НАБОР У 2009—2010 НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ НА ПАДРЫХТОЎЧЫЯ КУРСЫ І ПАДРЫХТОЎЧАЕ АДДЗЯЛЕННЕ.**

**ПАДРЫХТОЎЧЫЯ КУРСЫ** — дзённыя, вячэрнія, завочныя. **Прыём заяў** — кастрычнік месяц. **Пачатак заняткаў** — лістапад.

**ПАДРЫХТОЎЧАЕ АДДЗЯЛЕННЕ** — дзённая форма навучання (лістапад — чэрвень). Прымаюцца асобы з сярэдняй і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Залічэнне ажыццяўляецца па выніках субяседавання. **Прыём заяў** — кастрычнік месяц. **Пачатак заняткаў** — лістапад.

Звяртацца: г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17, п. 301, тэл. (017) 219 75 11, факс 222 24 09.
УНП 100286677.

Мікалай ФЯСЬКОЎ:

# «100 БАЛАЎ НА ЦТ — НЕ ВЫПАДКОВАСЦЬ, А ЎЗНАГАРОДА ЗА МЭТАНАКІРАВАНАСЦЬ»

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Апошняя прыёмная кампанія пабіла ў Расіі ўсе рэкорды па колькасці скандалаў і непрыемных сюрпрызаў. Упершыню ўсе расійскія ВНУ прымалі абітурыентаў па выніках адзінага дзяржаўнага экзамену (АДЭ), а абітурыенты маглі падаць свае заявы ў неабмежаваную колькасць ВНУ. У выніку на адно бюджэтнае месца нярэдка прэтэндавалі адразу па 80—100 чалавек. Такім чынам расійскія абітурыенты ператварыліся фактычна ў «адукацыйных турыстаў». Напрыклад, адна дзяўчына падала свае дакументы ў сталічную ВНУ адразу на 33 спецыяльнасці і «прайшла» па сваіх балах — на 22. Але арыгіналы дакументаў у прыёмную камісію яна так і не падала, можна меркаваць, што спыніла свой выбар на нейкай іншай ВНУ. У выніку працэдура залічэння ператварылася ў сапраўдны хаос. Некаторыя ВНУ ўвогуле так і не змаглі цалкам укамплектавацца. Таму рэктары вышэйшых навучальных установ папрасілі абмежаваць колькасць навучальных устаноў, куды абітурыенты змогуць заяўляць свае сертыфікаты. Згодна з праектам загада Міністэрства адукацыі і навукі РФ, у наступным годзе абітурыентам дазволяць «штурмаваць» адначасова толькі пяць навучальных устаноў і падаваць дакументы не больш чым на тры спецыяльнасці. Ёсць прапанова ўвесці таксама плату за падачу дадатковых заяў. Да таго ж да 1 кастрычніка павінны быць сфармуляваныя і патрабаванні, па якіх у наступным годзе будзе праводзіцца адзіны дзяржаўны экзамен. Не выключана, што Міністэрства адукацыі і навукі дазволіць ВНУ вызначаць парогавыя значэнні па балах у сертыфікаце не толькі па профільным прадмеце. Напрыклад, кіраўніцтва ВНУ вырашыць, што абітурыентаў, якія набралі менш чым 50 балаў па матэматыцы, яны да ўдзелу ў конкурсе дапускаць не будуць. Сёлета сапраўдныя «вяршкі» знялі Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт і Маскоўскі фізіка-тэхнічны інстытут, дзе сярэдні бал па матэматыцы перавысіў у наваспечаных першакурснікаў 85 балаў.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

# ДОБРАЕ СЭРЦА ДЛЯ ДОБРЫХ СПРАЎ

**Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі на працягу года ладзіць безліч самых разнастайных мерапрыемстваў. У іх ліку — дабрачынныя акцыі. Сёння слова «валанцёр» трывала ўвайшло ў наш ужытак і ўжо нікога не здзіўляе. Валанцёры — гэта добраахвотнікі, тыя, хто дапамагае бескарысліва, ад чыстага сэрца. Менавіта такіх людзей аб'ядноўвае заснаваны на традыцыях міласэрнасці і дабрачыннасці валанцёрскі моладзевы рух БРСМ «Добрае сэрца». Кожны дзень валанцёры робяць якую-небудзь добрую справу. Няхай яна не будзе маштабнай. Галоўнае дапамагчы таму, хто мае ў гэтым патрэбу. Больш падрабязна пра валанцёрскі рух «Добрае сэрца» мы папрасілі расказаць яго кіраўніка, сакратара ЦК БРСМ Варвару АЛЕКСАНДРОВІЧ.**

— Развіццё валанцёрскага руху — прыярытэтны напрамак дзейнасці Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі. На сёння «Добрае сэрца» аб'ядноўвае больш за 20 тысяч чалавек. Але для нас важна не колькасць, а асабістыя якасці кожнага ўдзельніка руху. Мы працуем па двух напрамках. Першы — арганізацыя пастаяннай работы валанцёраў у дзіцячых дамах, бальніцах, з адзінокімі састарэлымі людзьмі, ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны. Другі напрамак — дабрачынныя акцыі раённага, гарадскога, абласнога і рэспубліканскага маштабаў. Для прыцягнення новых удзельнікаў руху і павелічэння колькасці добрых спраў, добрых эмоцый, добрых парываў у людзей. Па ўсёй краіне валанцёры «Добрага сэрца» дапамагаюць наводзіць парадак на зямлі (прыводзяць у парадак паркі і скверы, сочаць за помнікамі, чысцяць лясы ад смецця). У Год роднай зямлі «Добрае сэрца» стварае экалагічныя атрады ва ўсіх без выключэння гарадах і раёнах нашай краіны. Напрыклад, толькі гэтай вясной нашы юнакі і дзяўчаты высадзілі больш за мільён дрэў.

***— А што датычыцца найбліжэйшых планаў?***

— Зараз пачынаем экалагічны валанцёрскі марафон у Гомелі. Акцыя валанцёраў «Добрае сэрца» «За чысты Гомель» адкрывае марафон па добраўпарадкаванні Гомеля. Там цяпер арганізавана работа 34 нашых валанцёрскіх экалагічных атрадаў. Заўтра юнакі і дзяўчаты зоймуцца добраўпарадкаваннем дарожак, газонаў, кветкавых клумбаў Гомельскага палацава-паркавага ансамбля, будуць афарбоўваць лаўкі каля цэнтральнага парку, ачышчаць прыбярэжную паласу ракі Сож. «Падары дзень свайму гораду!» — так заклікаюць нашы валанцёры. У гэтыя выхадныя пройдзе яшчэ адна цікавая акцыя — «Валанцёрскі лагер у Палацы». Валанцёры «Добрага сэрца» (будучыя беларускія архітэктары — студэнты БНТУ) накіруюцца па слядах італьянскіх дойлідаў у палац Храптовічаў у Шчорсах, што ў Гродзенскай вобласці Навагрудскага раёна. 40 нашых валанцёраў удзельнічаюць у гэтым двухдзённым валанцёрскім лагеры. Фронт работ: падрыхтоўка сядзібы Храптовічаў (гэта старажытны княжацкі род) да кансервацыі на зімовы перыяд, прыбіранне тэрыторыі і памяшканняў сядзібы, падрыхтоўчыя работы па рэстаўрацыі. Тут жа пройдзе студэнцкі творчы пленэр «Народжаныя ў Беларусі», прысвечаны Году роднай зямлі. Сама сядзіба вельмі цікавая. Гэта ўзор архітэктуры сінтэзу позняга барока і ранняга класіцызму. Палац Храптовічаў быў пабудаваны ў 1770—1776 гадах па праекце італьянскіх дойлідаў Дж. Сака і К. Спампані. Ён стаў цэнтрам сядзібна-паркавага ансамбля, вакол якога быў разбіты прыгожы англійскі парк з цэлым каскадам штучных азёраў.

Заўтра валанцёры БРСМ «Добрае сэрца» разам з аўтаклубам «FORSAGE» правядуць таксама трэнінг па бяспечным руху на дарозе для выхаванцаў дзіцячага дома № 5 г. Мінска, падораць дзеткам падарункі, узнагародзяць удзельнікаў і пераможцаў конкурсу дзіцячага малюнка «Я за бяспеку на дарозе». У дзяцей таксама з'явіцца магчымасць пракаціцца на гарадзе на аўтамабілях клуба, праўда, пад пільнай увагай ДАІ.

***— Варвара, так шмат добрых спраў робяць вашы валанцёры. А ўвогуле, валанцёры — хто гэта?***

—— Гэта людзі з добрым сэрцам. Гэта школьнікі, студэнты, дарослыя людзі, якія ўжо працуюць, г.зн. тыя, хто хоча павялічыць у нашым свеце працэнт дабрыні. З адкрытай чыстай душой, яны з натхненнем, з цікавасцю, з іскрынкай. Не проста мы сказалі, яны зрабілі. А яны самі прапануюць акцыі. Вельмі важна, што ёсць ініцыятыва. Прычым, гэта вельмі шчыра, ад душы.

***— Працуючы на тых ці іншых аб'ектах, потым іх курыруеце?***

—- Стараемся каб так было пастаянна. Напрыклад, мы прыходзім у дзіцячыя дамы. Потым нас дзеткі чакаюць, прывязваюцца да нашых валанцёраў, пачынаюць з імі сябраваць. У нас у кожным рэгіёне ёсць штабы добрых спраў. Юнакі і дзяўчаты на месцах самі ведаюць, што трэба іх гораду, раёну, каму патрэбна дапамога. Кожны штаб добрых спраў распрацоўвае свае акцыі. Напрыклад, даволі паспяховыя праекты мінскага абласнога штаба руху «Добрае сэрца». У першым паўгоддзі прайшоў нон-стоп марафон «Усе фарбы жыцця для цябе». Мерапрыемства падтрымалі сваім удзелам зоркі беларускай эстрады. Гэта былі дабрачынныя канцэрты па зборы сродкаў для хворых дзяцей. Першы канцэрт адбыўся ў студзені ў Маладзечне. Па выніках першага этапа дабрачыннага марафону валанцёры «Добрага сэрца» Міншчыны (амаль паўтары тысячы юнакоў і дзяўчат) пералічылі для лячэння 9-гадовай Лізы Мароз з Мінскага раёна, у якой нырачная недастатковасць, амаль 15 мільёнаў рублёў. Другі этап нон-стоп марафону адбыўся ў ліпені ў Капылі. У выніку больш за 5 мільёнаў накіравана на набыццё артапедычных хадункоў для чатырохгадовага Віці Аніхоўскага з Капыльскага раёна. Хачу прыгадаць яшчэ праект «Другое жыццё». Гэта акцыя па зборы металалому і макулатуры з мэтай сабраць сродкі для аказання адраснай дапамогі. Першы этап праекта быў праведзены ў Мінскай вобласці ў чэрвені. Атрыманыя сродкі накіраваны на лячэнне хворых дзяцей з усіх раёнаў сталічнай вобласці. Усяго юнакі і дзяўчаты сабралі за месяц сваёй работы 84 тоны металалому, 6 тон макулатуры амаль на 7 мільёнаў рублёў. Такім чынам, і парадак на зямлі навялі, і сродкі накіравалі на добрую справу. Увогуле мінскі абласны штаб вельмі актыўна ўдзельнічае ў руху, распрацоўвае цікавыя мерапрыемствы, якія потым робім рэспубліканскімі. І такая работа праводзіцца ва ўсіх раёнах краіны. І самае галоўнае, што маладыя людзі гэта робяць з душой і сэрцам.

***— А як можна стаць валанцёрам?***

— Гэта вельмі проста. Галоўнае прыйсці ў нашы раённыя, гарадскія арганізацыі, ЦК БРСМ. Мы ўсім рады і адкрыты для супрацоўніцтва. Усім раскажам дзе патрэбна дапамога. Звычайна кожны сам сябе знаходзіць у руху, выбірае тое, што яму найбольш цікава. Праяўляе ініцыятыву.

***Насамрэч рабіць дабро не так і складана. Як кажуць, галоўнае — жаданне. Аднак, калі разумееш, што камусьці змог дапамагчы, адчуваеш вялікае задавальненне. Рабіце дабро і яно, без сумнення, да вас вернецца!***

**Святлана СУХАРКО.**

Частное учреждение образования
«ИНСТИТУТ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЬСКОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ»
www.uoipd.org

**ОБЪЯВЛЯЕТ НАБОР**

на курсы по подготовке к **ЦЕНТРАЛИЗОВАННОМУ ТЕСТИРОВАНИЮ** 2010 года по предметам:

• **МАТЕМАТИКА** (группы до 20 чел.)
• **МАТЕМАТИКА** (группы до 5 чел.)
• **РУССКИЙ ЯЗЫК • БЕЛОРУССКИЙ ЯЗЫК**
• **ИНОСТРАННЫЕ ЯЗЫКИ • ИСТОРИЯ БЕЛАРУСИ**
• **ОБЩЕСТВОВЕДЕНИЕ**

**ОБУЧАЮЩИЕ КУРСЫ:**
• **АНГЛИЙСКИЙ • ФРАНЦУЗСКИЙ**
• **НЕМЕЦКИЙ • ИСПАНСКИЙ** (для среднего уровня)
• **ПСИХОЛОГИЯ БИЗНЕСА**
• **ПСИХОЛОГИЯ УПРАВЛЕНИЯ ОРГАНИЗАЦИЕЙ**
для учащихся 11 классов:
**ОСНОВЫ ЭКОНОМИЧЕСКИХ ЗНАНИЙ**

**(017) 247 08 77**
**Начало занятий с октября 2009 г.**

**Адрес института:**
**г. Минск, ул. Серафимовича, 11, каб. 607.**
Проезд: ст. м. «Пролетарская» (60м); трол. №№ 3, 16, 30, 36, 59 (до ост. «к/т «Ракета»).

**ЦЕНТР ПОДДЕРЖКИ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЬСТВА**
**ПРЕДЛАГАЕТ КУРСЫ ДЛЯ НАСЕЛЕНИЯ ПО СЛЕДУЮЩИМ НАПРАВЛЕНИЯМ:**
• «Оценка внешней среды и отраслевой анализ», • «Обучающий курс по эффективной коммуникации и правильной формулировке целей», • «Финансовый анализ и мониторинг деятельности предприятия», • «Антикризисное управление и финансовое оздоровление предприятий».
**Адрес: г. Минск, ул. Плеханова, 8.**
**Тел. (8 017) 295 28 90.**

# ІНСТЫТУТ САМАСТОЙНЫХ ЛЮДЗЕЙ

**Гэта ВНУ рыхтуе спецыялістаў, якія гатовы да самастойнай працы, стварэння ўласных малых і сярэдніх прадпрыемстваў — аператыўных, мабільных, тэхналагічных і інфармацыйных**

### У АСНОВУ АСНОЎ — АДКАЗНАСЦЬ

Адной з характэрных рыс пачатку XXI стагоддзя з'яўляецца высокая грамадска-эканамічная роля адукацыі. Узровень і маштабнасць вышэйшай адукацыі сталі адным з вядучых фактараў эканамічнага росту, прагрэсіўных сацыяльных зменаў і культурных пераўтварэнняў там, дзе дзяржаўная палітыка будуецца на прыярытэтах агульначалавечых каштоўнасцяў, сацыяльнай арыентацыі і ўстойлівага эканамічнага развіцця.

— Мы сёння рыхтуем спецыялістаў у сферы эканомікі для малога і сярэдняга бізнэсу і лінгвістаў. У хуткай будучыні пачнём выпускаць лінгвістаў-эканамістаў, — расказаў **рэктар Інстытута прадпрымальніцкай дзейнасці Віктар ЦЫБОЎСКІ.** — Плануем даваць будучым перакладчыкам паралельна другую вышэйшую адукацыю, для таго, каб яны маглі пашырыць свае прафесійныя магчымасці і былі здольныя ажыццяўляць міжнародныя эканамічныя сувязі. Гэта будуць ужо не проста перакладчыкі, а перакладчыкі-эканамісты.

Інстытут прадпрымальніцкай дзейнасці стварае асаблівае адукацыйнае асяроддзе, якое не проста выпускае будучых бізнэсменаў, а фарміруе прадпрымльнікаў з сацыяльнай і партнёрскай адказнасцю. Людзей, якія ў сваёй працы кіруюцца маральнымі і сацыяльнымі прынцыпамі.

Выпускнікі гэтай ВНУ добра засвойваюць, што ў сучасным свеце не дасягненне прыбытку павінна быць мэтай, не толькі гэта, але — карысць для людзей.

Па сутнасці, тут фарміруюць заможны сярэдні клас, які складае аснову сучаснага грамадства, забяспечвае эканамічную стабільнасць краіны. Таму ў Інстытуце прадпрымальніцкай дзейнасці вялікую ўвагу надаюць не толькі ведам, але і выхаванню, фарміраванню светапогляду выпускніка.

— Нашы студэнты — кажа рэктар, — гэта будучыя захавальнікі сямейных каштоўнасцяў, агульначалавечай культуры, духоўнасці і маралі. І толькі разам з усім гэтым — паспяховыя ў фінансавым плане людзі.

### ДРУГІ ЗАПАВЕТ — З НАРОДА І ДЛЯ НАРОДА

Другі важны прынцып Інстытута — народнасць. Тут не імкнуцца стварыць эліту. «Мы бяром людзей з народа, самых звычайных, зусім не абавязкова — выдатнікаў, і настройваем іх працаваць для народа», — кажуць выкладчыкі гэтай навучальнай установы.

І падкрэсліваюць, што нярэдка тыя выпускнікі школ, якія маюць не самыя высокія адзнакі ў атэстаце (што сведчыць не столькі пра здольнасці вучня, колькі пра стаўленне да яго настаўнікаў), становяцца потым не толькі паспяховымі прадпрымальнікамі, але і надзейнымі партнёрамі, свядомымі канкурэнтамі і годнымі асобамі.

**Ідуць заняткі на факультэце знешнеэканамічнай дзейнасці і прадпрымальніцтва.**

**Рэктар Віктар ЦЫБОЎСКІ.**

— Мы бяром усіх маладых людзей, якім па стане здароўя рэкамендавана навучанне ў вышэйшай навучальнай установе, — падкрэслівае Віктар Цыбоўскі, — і якія паказалі дастатковыя для гэтага вынікі Цэнтралізаванага тэсціравання.

Дзеці, у якіх былі праблемы ўзаемаадносінаў са школьнымі настаўнікамі, цалкам могуць валодаць якасцямі, неабходнымі для эканамічнага росквіту краіны, упэўнены рэктар. Тут важна толькі звесці да мінімуму верагоднасць выпадковага выбару. Каб моладзь прываблівала не проста прэстыжнасць ВНУ, а свядомае жаданне рэалізаваць сябе ў абранай сферы.

Каб даць новае жывое ўяўленне пра эканоміку і прадпрымальніцтва як лад жыцця, выкладчыкі Інстытута сёння бясплатна чытаюць адзінаццацікласнікам эканамічныя асновы ведаў.

Прынцыпу народнасці адпавядае і даступнасць навучання ў інстытуце прадпрымальніцкай дзейнасці. Аплата навучання ў 2009/2010 навучальным годзе складае каля трох мільёнаў. У Інстытуце існуе сістэма зніжак. Дзейнасць гэтай навучальнай установы не з'яўляецца камерцыйнай, а накіравана на раскрыццё патэнцыялу моладзі ў мэтах яе сацыялізацыі ў сучасных эканамічных умовах.

### ТВОРЧЫ ПАЧАТАК

Адна з галоўных задач Інстытута — падрыхтаваць спецыялістаў, здольных высакаякасна зрабіць паслугу, знайсці кантакт з кліентам, дапамагчы дзякуючы свайму прафесіяналізму іншаму чалавеку.

Не толькі веды, але і дастатковы ўзровень кампетэнцыі атрымліваюць студэнты ІПД. Гэта дазваляе ім на сваім працоўным месцы, якое, як правіла, з'яўляецца яшчэ падчас вучобы, паўнавартасна рашаць пастаўленыя задачы і прыўносіць інавацыі. Выпускнікі Інстытута здольныя мадэрнізаваць вытворчы працэс, прапанаваць тое новае, што паляпшае вынік працы і забяспечвае задавальненне ўсіх бакоў — як заказчыкаў, так і выканаўцаў.

Атрымліваецца гэта дзякуючы таму, што студэнты Інстытута прадпрымальніцкай дзейнасці маюць магчымасць добра адаптавацца да новай тэхналагічнай практыкі, у тым ліку ў сферы адносінаў паміж людзьмі.

У спісе баз праходжання практыкі студэнтамі Інстытута прыватныя прадпрыемствы, Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, БелАЗ, сумеснае таварыства «Атлант-М Усход», Вытворча-турыстычнае камунальнае прадпрыемства «Моладзевая сацыяльная служба».

Для кіраўніцтва курсавымі работамі і дыпломнымі праектамі тут запрашаюць кампетэнтных у сваёй дзейнасці кіраўнікоў розных сфераў.

### ГАЛОЎНАЯ ЎМОВА ДЛЯ ПРАЦВІТАННЯ

Гэта навучальная ўстанова паступова выпраўляе сітуацыю, калі пакупнік у краме, кіроўца на станцыі тэхнічнага абслугоўвання, кліент у цырульні, наведвальнік у рэстаране адчуюць сябе няўтульна. Тут вучаць не проста ствараць сваю ўласную справу, але прыносіць задавальненне ўсім, і галоўным чынам тым, хто плаціць за створаны тавар.

За прадпрымальніцтвам будучае краіны, упэўнены не толькі заснавальнікі ВНУ, але і вядучыя эканамісты-аналітыкі. Сёння малы бізнэс цудоўна развіваецца ў сельскай мясцовасці. Для стварэння невялікага перапрацоўчага цэха не патрэбна вялікіх укладанняў. Да таго ж, ёсць магчымасць узяць крэдыт, а калі гаспадар такога прадпрыемства не толькі зможа ўсё добра пралічыць з пункту погляду эканомікі і фінансаў, але і будзе вырабляць эксклюзіўны прадукт альбо створаць паслугу, імкнуцца прынесці карысць сваёй мясцовасці і людзям, то поспех будзе забяспечаны. І прыкладаў таму дастаткова.

Ды і ў вялікіх гарадах, як паказвае вопыт Заходняй Еўропы, непаўторныя малатыражныя вырабы і паслугі карыстаюцца ўсё большым і большым попытам.

### ЯК ГЭТАМУ ВУЧАЦЬ

Сфарміраваць у студэнтаў менталітэт карысці для людзей і грамадства — на гэта накіраваны вучэбныя праграмы Інстытута прадпрымальніцкай дзейнасці, спецыялізацыя, падбор выкладчыкаў і выбар прадпрыемстваў, з якімі ВНУ супрацоўнічае.

Асаблівасць Інстытута ў тым, што яго выпускнікі паўнавартасна валодаюць не толькі тэорыяй, але і практыкай.

— Блок гуманітарных дысцыплін, які мы чытаем, дазваляе нашым студэнтам правільна вызначыць сэнс прафесійнай дзейнасці чалавека з вышэйшай адукацыяй, — тлумачыць рэктар. — На гэта накіраваны таксама шматлікія семінары, канферэнцыі, выхаваўчая работа, масавыя мерапрыемствы: паказаць каштоўнасць жыцця чалавека, яго імкнівасць і ў сувязі з гэтым неабходнасць прынесці карысць. Каб маладыя людзі, якія скончылі нашу ВНУ, не кідаліся туды, дзе больш плацяць, а самі маглі нешта ствараць, і ствараць тут, у сваёй краіне.

Паспяхова вырашаць гэту задачу дазваляе параўнальна невялікая колькасць студэнтаў — 2750. У гэтай ВНУ, у адрозненне ад буйных навучальных устаноў, захоўваюцца традыцыі класічнай адукацыі, якая пабудавана на індывідуальнай рабоце з кожным студэнтам, перадачы асабістых якасцяў ад Настаўніка — вучню.

Інстытут прадпрымальніцкай дзейнасці вядзе значную навуковую работу, супрацоўнічае з ВНУ Расіі, Польшчы, Украіны.

### ВЫПУСКНІКІ

Наколькі Інстытут паспяхова рашае свае задачы, сведчаць месцы працы і пасады яго выпускнікоў. Гэта дырэктары і намеснікі прыватных, сумесных, унітарных, замежных прадпрыемстваў, кіраўнікі сэрвісных службаў, турыстычных кампаній, загадчыкі крамаў, адзелаў харчавання буйных гатэляў, гандлёвых секцый...

На базе Інстытута прадпрымальніцкай дзейнасці створаны Цэнтр падтрымкі прадпрымальніцтва. Тут дапамагаюць студэнтам, выпускнікам і ўсім прадпрымальнікам у атрыманні неабходнай інфармацыі для арганізацыі і вядзення ўласнай справы. Усе ахвотныя могуць атрымаць у Цэнтры, а таксама на сайце Інстытута www.uoipd.org юрыдычную кансультацыю. Супрацоўнікамі Цэнтра распрацаваны курсы: «Ацэнка знешняга асяроддзя і галіновы аналіз», «Навучальны курс па эфектыўнай камунікацыі і правільнай фармулёўцы мэтаў», «Фінансавы аналіз і маніторынг дзейнасці прадпрыемства», «Антыкрызіснае кіраванне і фінансавае аздараўленне прадпрыемстваў» і інш.

Сёння Інстытут распрацоўвае праект па стварэнні трэніровачнай лабараторыі ў рамках Цэнтра.

Інстытут прадпрымальніцкай дзейнасці быў створаны 17 гадоў таму як адказ на выклік часу. Немалая заслуга гэтай навучальнай установы ў стварэнні прадпрымальніцкага асяроддзя ў нашай краіне. А таксама ў тым, што Беларусь не пацярпела ад «дзікунскага бізнэсу». Сёння, у сувязі з неабходнасцю аздараўлення нацыянальнай эканомікі, для выхаду не толькі краіны, але і ўсяго свету на новы эканамічны этап, узнік асаблівы попыт на ініцыятыўных, смелых, самастойных і адказных людзей. Такіх, якія могуць знаходзіць выйсце са складаных сітуацый, і пры гэтым клапоцяцца не толькі і не столькі пра сябе. Якраз такіх выхоўваюць і фарміруюць у Інстытуце прадпрымальніцкай дзейнасці.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**

УНН 101357946.

# «100 БАЛАЎ НА ЦТ — НЕ ВЫПАДКОВАСЦЬ, А ЎЗНАГАРОДА ЗА МЭТАНАКІРАВАНАСЦЬ»

*(Заканчэнне.*
***Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

Увогуле АДЭ здавалі ў 2009 годзе 930 тысяч выпускнікоў, а максімальны бал набралі толькі 2336 чалавек, што складае 0,2 працэнта ад агульнай колькасці. Пры гэтым пасля пераправеркі 370 стабальных работ у 25 працэнтах выстаўленыя балы не пацвердзіліся. А 2,7 працэнта расійскіх выпускнікоў не змаглі прайсці дзяржаўную выніковую атэстацыю па матэматыцы і рускай мове.

Яшчэ адзін скандал быў звязаны са з'яўленнем у інтэрнэце некалькіх варыянтаў кантрольна-вымяральных матэрыялаў па матэматыцы: абітурыенты, якія здавалі АДЭ ў Магадане, проста сфатаграфавалі іх на мабільны тэлефон і размясцілі затым у Сусветнай павуціне. Праўда, тэхналагічныя магчымасці дазволілі без праблем устанавіць парушальнікаў працэдуры здачы АДЭ — іх вынікі экзамену былі ануляваныя, а на арганізатараў АДЭ, якія знаходзіліся ў аўдыторыі, былі накладзены адміністрацыйныя спагнанні. Але асадак, як кажуць, усё адно застаўся... А нядаўна стала вядома, што Федэральная служба па наглядзе ў сферы адукацыі і навукі плануе правесці ў некаторых расійскіх ВНУ экзамены для першакурснікаў па тэстах адзінага дзяржаўнага экзамену 2009 года, каб праверыць, наколькі адэкватна былі выстаўлены адзнакі. Ужо вядома, што такія іспыты пройдуць у Татарстане, Краснадарскім краі, Маскве і Варонежскай вобласці. Прадстаўнікі Федэральнай службы заспакойваюць, што перагляду вынікаў АДЭ не будзе і ніхто адлічаны з ВНУ не будзе. Галоўная мэта маніторынгу — высветліць, як карэлююцца вынікі АДЭ з рэальным узроўнем ведаў. Таксама ў рамках маніторынгу будуць правераны і тыя студэнты, якія праходзілі дадатковыя іспыты ў ВНУ...

— Апошнім часам многія памылкова спрабуюць праводзіць паралелі паміж расійскім адзіным дзяржаўным экзаменам (АДЭ) і нашым цэнтралізаваным тэсціраваннем, не разумеючы розніцы, — падзяліўся сваімі думкамі **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯЎСЬКОЎ**, да якога мы звярнуліся з просьбай пракаментаваць жарсці, якія кіпяць вакол расійскай прыёмнай кампаніі. — Я асабіста абсалютна перакананы, што аб'ядноўваць адначасова выніковую атэстацыю за курс сярэдняй школы з уступнымі экзаменамі — вялікая памылка, паколькі пры правядзенні выніковай атэстацыі выкарыстоўваецца нарматыўна крытэрыяльны падыход, а пры абітурыенцкім тэсціраванні — нарматыўна арыентаваны. Задача нашага ЦТ заключаецца ў тым, каб размеркаваць абітурыентаў па ўзроўні падрыхтоўкі і суаднесці іх паміж сабой, пабудаваўшы найбольш дакладны рэйтынг прэтэндэнтаў на званне студэнта, а не пацвердзіць школьную адзнаку. У беларускіх тэстах у адрозненне ад расійскіх няма вобласці С, якая ўключае заданні, што носяць творчы характар і патрабуюць разгорнутага адказу або сачынення-разважання і маюць павышаны ўзровень складанасці. Заданні вобласці С правяраюцца не камп'ютарнай праграмай, а педагогамі-экспертамі, што аўтаматычна павялічвае долю суб'ектывізму пры выстаўленні адзнакі. Тая акалічнасць, што вынікі АДЭ праглядаюцца ў расіян і ў бок павышэння, і ў бок паніжэння тэставых балаў, тлумачыцца наяўнасцю менавіта заданняў вобласці С. Мы ад гэтага, на шчасце, застрахаваныя.

Кошт кожнага задання ў нашым інстытуце разлічвае камп'ютарная праграма ў залежнасці ад таго, колькі ўдзельнікаў ЦТ змаглі з ім справіцца: чым меншая колькасць абітурыентаў далі правільны адказ, тым большую «вагу» будзе мець такое заданне пры падліку тэставага бала. Напрыклад, на цэнтралізаваным тэсціраванні па матэматыцы ў нас былі ў гэтым годзе два заданні, якія выканалі амаль усе: у адным выпадку 93 працэнты і ў другім — 91 працэнт. Атрымалася, што вартасць гэтых заданняў блізкая да нуля. Гэта лепшы доказ таго, што лёгкія заданні маюць дрэнную дыферэнцыравальную здольнасць і не могуць выкарыстоўвацца для складання рэйтынгавага спісу прэтэндэнтаў на званне студэнта, як і звышскладаныя заданні, з якімі не зможа справіцца ні адзін з абітурыентаў. Прасцей кажучы, нельга бясконца спрашчаць тэставыя заданні. Важна, каб тэсты як мага больш адпавядалі ўзроўню сярэднестатыстычнага абітурыента, які таксама можа змяняцца, і мы павінны гэта тонка адчуваць. Таму я лічу неапраўданым павялічваць тэрмін дзеяння сертыфікатаў ЦТ, бо і склад абітурыентаў, і спецыфікацыя тэстаў могуць змяняцца, а расіяне і ў наступным годзе плануюць прымаць у ВНУ сертыфікаты АДЭ гэтага года. А калі ён будзе прасцейшым ці больш складаным, чым у папярэднім годзе?

Дарэчы, мы правялі па выніках сёлетняга тэсціравання адзін цікавы аналіз. Прыкладна 17 працэнтаў тых, хто здаваў цэнтралізаванае тэсціраванне, сталі студэнтамі бюджэтнай формы навучання ВНУ. Таму па кожным прадмеце мы вылучылі 17 працэнтаў удзельнікаў ЦТ, якія паказалі лепшыя вынікі, і высветлілася, што ў гэтых абітурыентаў даволі высокія балы: па беларускай мове — больш як 77 балаў, па рускай мове — больш як 69 балаў і гэтак далей. Такім чынам мы яшчэ раз пераканаліся, што створаная намі сістэма дазваляе адабраць самых падрыхтаваных абітурыентаў. Прызнаюся, што нас заўсёды цікавіць маладыя людзі, якім удаецца «дацягнуцца» на цэнтралізаваным тэсціраванні да 100-бальнага выніку: цікавіць іх паспяховасць па іншых школьных прадметах, цікавіць, як яны рыхтаваліся да тэстаў, якую ролю адыгралі іх настаўнікі, якія балы яны атрымалі на ЦТ па іншых дысцыплінах. Як правіла, і па двух іншых тэстах вынікі ў гэтых маладых людзей не ніжэйшыя чым 90 балаў. Напрыклад, па выніках цэнтралізаванага тэсціравання па хіміі ўсе чатыры стабальнікі сёлета — выпускнікі Ліцэя БДУ. А хімічная, фізічная, матэматычная школы ў гэтай навучальнай установе надзвычай моцныя, што ліцэісты пастаянна пацвярджаюць на розных міжнародных інтэлектуальных спаборніцтвах. Увогуле традыцыйна лепшыя вынікі на ЦТ у выпускнікоў навучальных устаноў новага тыпу — гімназій і ліцэяў.

Сёлета сярод абітурыентаў былі дзве дзяўчыны, якія атрымалі на ЦТ два стабальныя вынікі (па беларускай мове і біялогіі): выпускніца Магілёўскага абласнога ліцэя № 3 Кацярына Якубёнак і выпускніца віцебскай гімназіі № 8 Таццяна Дзятлоўская. Наколькі нам вядома, іх поспех быў зусім невыпадковым і стаў узнагародай за штодзённую шматгадзінную працу, за іх мэтанакіраванасць і работу над сабой. Абедзве яны сталі студэнткамі медыцынскіх універсітэтаў.

І ўсё ж такі я лічу, што падрыхтаваць стабальніка — неактуальная задача ў дачыненні да цэнтралізаванага тэсціравання, паколькі галоўным з'яўляецца не абсалютны вынік, а перавага ў параўнанні з іншымі абітурыентамі. У ідэале асноўная маса абітурыентаў павінна знаходзіцца ў дыяпазоне ад 40 да 60 балаў, а абсалютных вынікаў увогуле быць не павінна, хіба толькі ў якасці выключэння, каб пацвердзіць, што нерашальных заданняў на ЦТ няма і з усімі заданнямі можна справіцца за адведзены час. 100 балаў — гэта, калі хочаце, своеасаблівы бальзам на душу нашых апанентаў, якія папракаюць тэсты ў празмернай складанасці, і доказ таго, што тэсты па сілах у тым ліку і выпускнікам сельскіх школ. Немалаважна, што «геаграфія» стабальных вынікаў ахоплівае ўсю краіну. Увогуле, на маю думку, для нашай краіны цэнтралізаваны адбор прэтэндэнтаў на навучанне ў ВНУ або сярэдніх спецыяльных навучальных установах ужо даўно стаў будзённай справай і не выклікае такога ажыятажу, як яшчэ 5 гадоў таму.

Напрыканцы Мікалай Фяськоў паведаміў, што нядаўна ў продаж паступілі два зборнікі, куды ўвайшлі тэсты па рускай і беларускай мовах, якія былі прапанаваныя абітурыентам у 2004—2008 гадах. Гэтыя зборнікі ўключаюць таксама адказы да ўсіх заданняў і дазваляюць прасачыць асноўныя тэндэнцыі ў фарміраванні тэстаў за апошнія гады. Плануецца таксама выдаць зборнікі рашэнняў да тэставых заданняў па фізіцы і матэматыцы гэтага года. А яшчэ ў Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў рыхтуюцца да правядзення першага раўнда рэпетыцыйнага тэсціравання, які стартуе ўжо ў кастрычніку. Рэпетыцыйнае тэсціраванне — гэта свайго роду трэніроўка і знаёмства з тым, як выглядаюць бланкі адказаў, якія дзейнічаюць патрабаванні да іх запаўнення, як правільна размяркоўваць час пры выкананні тэста. Усё гэта таксама вельмі важныя складнікі паспяховага ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні, як і псіхалагічная загартоўка — усё ж такі экзамен ёсць экзамен. І лепш, калі ёсць такая магчымасць, арганізаваць для сябе яго рэпетыцыю...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ДОБРЫ ДЗЕНЬ, Я ВАША... ВАЖАТАЯ!

**Выпрабавана на сабе**

Пасля вясновай сесіі ў кожнага студэнта адразу ўзнікае процьма планаў, як правесці лета. Столькі ўсяго трэба паспець, што і не ведаеш, за што схапіцца і куды кінуцца. Звычайна ўсе такія вялікія планы сумна заканчваюцца — доўгае лета некуды знікае, а толкам нічога не зроблена. А для таго, каб прымусіць сябе хоць нешта рабіць, лепш за ўсё знайсці працу. Тут ужо кожны выбірае занятак на свой густ, але зразумела, што лепшы варыянт для лета той, што дазваляе і адпачыць.

І таму, пачуўшы пра працу важатым у прыморскім дзіцячым лагеры, амаль што кожны згодны ехаць туды хоць на наступны дзень. Але калі пачынаеш высвятляць усе падрабязнасці такой вандроўкі, гэта ідэя перастае выглядаць такой бясхмарнай. Проста так паехаць на мора і самому ўладкавацца на працу, хутчэй за ўсё, не атрымаецца. Бо адміністрацыя лагера пераважна супрацоўнічае з грамадскімі арганізацыямі, якія накіроўваюць да іх ужо сфарміраваныя педагагічныя атрады. Прасцей за ўсё звярнуцца ў такую арганізацыю і атрымаць накіраванне. Так я і зрабіла. Сябар параіў звярнуцца ў рэспубліканскую моладзевую грамадскую арганізацыю «Ліга добраахвотнай працы моладзі». Галоўнае слова ў назве — «добраахвотнай», таму на тое, каб вярнуцца дамоў з «кругленькай» сумай зароблены грошай, не разлічвайце. З вашага заробку лагер вылічвае грошы за ежу і жыллё. І хоць расцэнкі тут па курортных мерках не вельмі высокія, але ўсё адно на рукі вы атрымаеце суму, што пра яе і ўспамінаць не варта.

Дарэчы, студэнцкія атрады — не адзіны напрамак дзейнасці лігі, якая існуе з 1994 года. Звязаная яна і з міжнародным валанцёрскім рухам. Ад яе магчыма паўдзельнічаць у розных па працягласці праграмах і пабываць валанцёрам у Германіі, Францыі, Італіі, Польшчы і іншых еўрапейскіх краінах.

Але самае масавае супрацоўніцтва наладжана з дзіцячымі лагерамі Краснадарскага края, куды накіроўваецца больш за 400 чалавек штогод.

Вось у такой праграме я і вырашыла ўзяць удзел разам з мноствам іншых беларускіх студэнтаў. Ніякіх асаблівых звышпатрабаванняў да нас не было, як высветлілася падчас гутаркі. Трэба было разумець, навошта вы едзеце ў лагер, мець добрую матывацыю, адэкватныя паводзіны і пажадана вопыт працы важатым, свае таленты і здольнасці, якія маглі б дапамагчы вам у няпростым лагерным жыцці. Частка дзяўчат і юнакоў ехала адпрацоўваць педагагічную практыку, а частцы — і мне ў тым ліку — проста не было чым заняцца летам.

### Праз церні да зорак

Як аказалася, добраахвотна — зусім не значыць, што бясплатна. Па-першае, трэба выплаціць членскі ўзнос за ўступленне ў лігу. Па-другое, трэба знайсці грошы на цягнік і дарожныя выдаткі. Магчыма, для кагосьці заплаціць за паездку сумы прыкладна ў 130 умоўных адзінак і не стане вялікай стратай для кішэні, але мой бюджэт, заснаваны на бацькоўскіх зарплатах, не так лёгка дазволіў сабраць гэтую суму.

І, па-трэцяе, трэба назапасіцца цярпеннем, каб прайсці ўсе агляды і аналізы для афармлення санітарнай кніжкі. Без яе працаваць з дзецьмі вам не дазволяць. Выглядае спіс абавязковых працэдур даволі непрыемна, ды і не толькі выглядае, але і робіцца. Але каб жа гэта было толькі непрыемна! Пакуль збярэш усе даведкі і подпісы, паспееш аб'ехаць палову Мінска. Па адну пячатку даводзіцца ехаць у іншы канец горада, а большасць аналізаў мне давялося апляціць самой, бо арганізацыя, ад якой я ехала, была недзяржаўная.

Калі ж вы мінулі ўсе перашкоды і нарэшце апынуліся ў цягніку, пачынаюцца бясконцыя разважанні аб тым, што ж вы будзеце рабіць з дзецьмі. Маіх разважанняў хапіла толькі на першую гадзіну паездкі. Пасля было не да таго. Калі збіраешся на мора, марыш пра гарачыню і сонца. Але калі ты ў душным цягніку, дзе няма кандыцыянера, ды ў дадатак у цябе «верхняя бакавая» паліца каля прыбіральні, то паспееш зненавідзець і тое сонца, і лета.

Цяжка нават уявіць нашу палёгку, калі скончылася гэта пякельнае падарожжа. Крыху збянтэжыла тое, што на незнаёмай станцыі давялося з нашымі клункамі самастойна шукаць аўтобус.

### Суцэльныя нечаканасці

Лагер сустрэў нас у восем гадзін раніцы пякучым сонцам і зарадкай.

Уражанне ад першых гадзін цяжка нават апісаць. Усе некуды спяшаюцца, навокал чароды дзяцей, хто ідзе строем, хто выкрыквае свой дэвіз, нічога не зразумела, а ты не ведаеш, куды сябе дзець.

Большасць важатых-пачаткоўцаў атрымалі свае атрады ў той жа дзень, а я паznаёмілася са сваім толькі на наступны. Складана нават растлумачыць, што адчула я — дзяўчына ростам у паўтара метра — калі ўбачыла 25 амаль дарослых хлопцаў з суворайскага ваеннага вучылішча, якія і сталі маім атрадам. І хоць хутка на атрад паставілі яшчэ адну важатую, усё адно стрымліваць «дзетак», якія фактычна вырваліся з арміі, было недзе за мяжой нашых магчымасцяў.

Даволі хутка стала відавочна, што абяцанні, пра вольны час на адпачынак, не вельмі суадносяцца з рэальнасцю. Часу не было нават выспацца як след. Усе намаганні былі накіраваны на спробы сабраць сваіх хлопцаў па дзявочых пакоях трох карпусоў, развагі, як хоць нешта прымусіць іх зрабіць на чарговым мерапрыемстве, і нават пасля адбою спакою важатым не было: яны павінны былі дзяжурыць пад дзвярыма пакояў, каб дзеці не паразбягаліся хто куды.

Але скардзіцца на тое, што мае «суворайцы» былі самым складаны атрадам, не выпадае. Можна сказаць, што мне нават пашанцавала. Бо былі і так званыя «сацыяльныя» атрады (сіроты і ўсыноўленыя дзеці), у якіх было па сорак малых. Былі і атрады з дзецьмі з асаблівасцямі псіхічнага развіцця. Самі можаце ўявіць, колькі энергіі і нерваў трэба, каб тыдні змены ні на хвіліну не губляць ніводнага са «сваіх» падапечных ды прыдумаць, чым іх заняць.

Былі і невялікія атрады, і прафесійныя калектывы, якія прыязджалі са сваімі кіраўнікамі. З такой дапамогай працаваць было зручней, але толькі да таго часу, пакуль вы поўнасцю згаджаліся з пунктам гледжання суправаджэння. А дамовіцца з суправаджальнікамі часам было вельмі няпроста...

Увогуле, адчуванне напружанасці не пакідала мяне ўсю змену. Многія важатыя прасцей паставіліся да сваіх абавязкаў. А я ніяк не магла забыцца на тое, што ў мяне крымінальная адказнасць за кожнага з 25 дзяцей... Простая лічба «15» (а столькі гадоў можна атрымаць, калі, барані Божа, што здарыцца з дзіцем) чамусьці ўвесь час не выходзіла з галавы.

### Плюсы і мінусы

Жалезных нерваў ні ў кога няма, і часам вельмі хацелася хоць на хвіліну збегчы куды-небудзь, забыцца пра тых дзяцей і пра тую адказнасць. Але за 21 дзень выхадных па кантракце было выдзелена толькі два, а ў астатнія дні рабіць трэба было тое, што стаіць у раскладзе, а не тое, што ахвота. Таму калі збіраешся працаваць важатым, рыхтуйся да таго, што адпачынак табе будзе толькі сніцца (калі знойдзеш час паспаць).

Рэдкія выхадныя — гэта сапраўднае свята для стомленага розуму. Але нават калі адзін ляжыш на пляжы, цябе аўтаматычна падкідвае кожныя некалькі хвілін, каб паглядзець, чым занятыя дзеці. Ідзеш у краму, і раптам думка: «А дзеці дзе?!» Адключыцца амаль немагчыма.

Але пакутуюць ад «важацкіх будняў» не толькі нервы, але і... галасавыя звязкі. Нязвыклыя да пастаяннага падвышанага тону, яны «хрыпяць» увесь час. Да таго ж кожнага — без выключэнняў — чакае акліматызацыя, якая выглядае як звычайная прастуда. Але прастуда не вызваляе вас ад вашых абавязкаў, таму аб нармальным голасе да вяртання дамоў можна толькі марыць.

Праўда, ніхто і не абяцаў, што будзе лёгка. І нягледзячы на ўсе мінусы, плюсоў таксама хапае. Для мяне асноўным плюсам стала тое, што я даказала сама сабе, што здольная вытрымаць такую адказнасць на працягу двух зменаў. Несумненна і тое, што з'явіцца шмат новых знаёмых і, калі пашанцуе, сяброў.

Не забудуцца і дзеці. За гэты кароткі час можна вельмі моцна прывязацца да кожнага з іх і вельмі шкада развітвацца. Як вядома, дрэннае забудзецца, а добрае застанецца назаўсёды ў нашых сэрцах. І хоць было неймаверна складана, яно таго каштавала. Паспрабаваць папрацаваць з дзецьмі раю кожнаму, бо больш нідзе, мабыць, вы не набудзеце такіх карысных назіранняў і неацэннай жыццёвай практыкі.

**Ганна ЦАР.**

## ПлацдАРМ

# Падмурак Арміі

**У Беларусі існуе некалькі прафесійных святаў для вайскоўцаў. Гэта і Дзень танкіста, і Дзень памежніка, і вядомы ўсім з розных бакоў Дзень дэсантніка, і іншыя святы. Зусім нядаўна мы сталі адзначаць Дзень мотастралкоў.**

Гэтае свята ў нашай краіне мае зусім кароткую гісторыю. Дзень мотастралкоў адзначаецца ў нас 21 верасня ў гонар заслуг і гераізму стралковых, мотастралковых і механізаваных аб'яднанняў, злучэнняў і вайсковых часцей у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Пяхота мае даўнія вытокі, больш за тое, яна з'яўляецца найбольш старым родам сухапутных войскаў. Пяхотныя падраздзяленні, часці ды злучэнні ад кастрычніка 1918 года сталі афіцыйна называцца стралковымі, слова «пяхота» захавалася ва ўжытку толькі для наймення рода войскаў. Доўгі час мотастралковыя палкі не былі задзейнічаны ва Узброеных Сілах СССР. Іх стварыць толькі ў год пачатку Другой сусветнай вайны, 1939. Менавіта мотастралковая дывізія сталася адной з самых першых перашкод для гітлераўцаў на беларускай зямлі, калі нямецкія войскі распачалі вайну супраць Савецкага Саюза. Гэта была 1-я Маскоўская дывізія, што на двое сутак затрымала праціўніка на падыходах да Барысава. Сілы суперніка пераўзыходзілі сілы мотастралкоў, якія змушаны былі адступаць у кірунку Оршы. Тым не менш, і ў такой сітуацыі яе камандзіру палкоўніку Я. Крэйзеру ўдалося разумнымі рашэннямі і загадамі падначаленым запаволіць рух войскаў Трэцяга рэйха. Дарэчы, Крэйзер стаў адным з першых на Заходнім фронце, каму прысвоілі званне Героя Савецкага Саюза. Адзначаліся гераічнымі подзвігамі гэтыя войскі і ў баях пад Оршай, Мінскам, Віцебскам, Смаленскам, Курскам, іншымі гарадамі.

Якраз на Заходнім фронце ўтварылася і праславіла сябе Савецкая гвардыя. А былі ж шараговыя 100-я, 127-я, 153-я, 161-я стралковыя дывізіі. За стойкасць і нежаданне саступаць ворагу, за выбітную адвагу пры абароне і пры наступленні яны былі ператвораны ў 1-ю, 2-ю, 3-ю і 4-ю гвардзейскія.

Падчас вайны пяхота абсталёўвалася больш дасканалай зброяй, транспартам, іншай вайсковай тэхнікай і па магчымасці атрымоўвала ўсебаковае развіццё. Нярэдкімі былі выпадкі, калі дзеля ўзмацнення да стралкоў далучаліся танкавыя і артылерыйскія злучэнні. Па заканчэнні вайны стралковыя войскі зноў узброіліся новай тэхнікай, такой, як браніраваныя баявыя машыны і найноўшыя віды зброі, што павялічвалі іхнюю мабільнасць і рухомасць нават непасрэдна на БМП. У 1957 годзе ў выніку невялічкай рэформы войскаў стралковыя і механізаваныя дывізіі былі ператвораныя ў мотастралковыя. Далей пехацінцы працягвалі ўдасканальвацца як род войскаў. Цяпер механізаваныя злучэнні і мотастралковыя падраздзяленні — падмурак Сухапутных войскаў Узброеных Сілаў Беларусі.

Сваё прафесійнае свята беларускія мотастралкі сустрэлі не адны, а з калегамі з Расіі, з якімі знаходзіліся на вучэннях «Захад-2009».

**Арцём СІЗІНЦАЎ.**

## «ТЭАТРАЛЬНЫ КУФАР»: ТРАДЫЦЫІ, ПОШУКІ, ЭКСПЕРЫМЕНТ...

**VI Міжнародны фестываль студэнцкіх тэатраў «Тэатральны куфар-2009» «стартуе» ў беларускай сталіцы 28 верасня. Яго арганізатарам і ідэйным натхняльнікам выступае Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.**

У гэтым годзе да ўдзелу ў «Тэатральным куфры» запрошаны тэатральныя калектывы з Беларусі, Расіі, Англіі, Бельгіі, Латвіі, Мексікі, Сербіі, Германіі, Грэцыі, Ірана, Польшчы, Алжыра, Літвы, Турцыі, Эстоніі, Славеніі, якія вынесуць на суд гледачоў 22 спектаклі (колькасць гасцей дасягае 300 чалавек). Паколькі галоўнай мэтай фестывалю з'яўляецца крэатыўная самарэалізацыя маладых людзей і папулярызацыя студэнцкай тэатральнай творчасці, то і дэвіз фестывалю будзе адпаведны — «Традыцыі. Пошук. Эксперымент». У рамках фестывалю плануецца паказаць два новыя праекты: «Манок» і «Koufar-to-Stage». Праект «Манок» аб'ядноўвае два спектаклі ў жанры «монадрама», якія аблюстроўваюць два бачанні свету, дзве гармоніі — мужчынскую (у версіі тэатра з Турцыі) і жаночую (у версіі польскага тэатра).

Праект «Koufar-to-Stage» скіраваны, у сваю чаргу, на ўмацаванне творчых сувязяў, набытых на фестывалі «Тэатральны куфар» у папярэднія гады. Так, рэжысёр тэатра «TUT» Тартускага ўніверсітэта Калев Куду ажыццявіў падрыхтоўку спектакля «Елізавета Бам»(па п'есе Д. Хармса) у тэатры «На балконе» БДУ. А рэжысёр тэатра «На балконе» Сяргей Турбан паставіў спектакль «Жарты пра каханне» па п'есах «Юбілей» і «Прапанова» А.П. Чэхава ў тэатры «TUT» Тартускага ўніверсітэта. Па традыцыі ў рамках фестывалю будуць ладзіцца майстар-класы тэатральных рэжысёраў і педагогаў, семінары-практыкумы, у ходзе якіх адбудзецца ўзаемаабмен тэатральнымі і эстэтычнымі ідэямі ў галіне рэжысуры, акцёрскага майстэрства, сцэнаграфіі, а таксама навацыямі ў сферы студэнцкай тэатральнай творчасці.

У склад міжнароднага журы ўвойдуць у гэтым годзе вядучыя тэатральныя дзеячы, педагогі, рэжысёры і крытыкі з Літвы, Балгарыі, Беларусі, Турцыі, Філіпінаў, Калумбіі, Расіі, Мексікі і Эстоніі. Ім трэба будзе вызначыць лепшыя рэжысёрскія, акцёрскія работы (першага і другога плана) і лепшую сцэнаграфію. А Гран-пры фестывалю, «Прыз глядацкіх сімпатый», атрымае той спектакль, які пераможа па выніках рэйтынгавага галасавання гледачоў. Спектаклі будуць ісці на двух пляцоўках: у Палацы прафсаюзаў і на сцэне Ліцэя БДУ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Пісьмо ў нумар**

# МНЕ СНЯЦЦА СНЫ ПА-БЕЛАРУСКУ!

Нямногія жыхары нашай краіны размаўляюць на роднай мове. На вялікі жаль, вельмі нямногія. Таму людзей, якія дыхаюць ёю, якія не могуць абысціся ў сваім жыцці без такіх слоў, як «дзякуй», «калі ласка», «матуля», «дабранач», вельмі прыемна сустракаць. З імі так і хочацца гаварыць, гаварыць, гаварыць... А яшчэ... іх хочацца слухаць, слухаць, слухаць. Мабыць, яны адначасова прывабліваюць, прыцягваючы, і прыцягваюць прывабліваючы сваёй незвычайнасцю, арыгінальнасцю і сваёй у нейкай ступені, гераічнасцю. Так, патрыётаў роднай мовы не вельмі многа (скажам мякка), асабліва ў асяроддзі моладзі, але яны ёсць. І гэта не можа не радаваць. Не можа не задавальняць.

Дзяўчыне 19 гадоў. Адразу яна здалася мне дзівачкай. Па-першае, выглядала неяк «не як усе» (элементы арнаменту на джынсах, рознакаляровыя стужачкі, уплеценыя ў валасы), а па-другое, вяла са мною, ды і з іншымі таксама, гаворку толькі па-беларуску. Толькі па-беларуску! Для мяне гэта ёсць, было і будзе звыш усяго самага незвычайнага. Пачуць жывую беларускую мову, даведацца, як гучаць многія моладзевыя выразы на ёй — гэта дарагога варта. Не падлічыць гэтага матэрыяльна, у якіх-небудзь у.а. Адсюль у маім аповедзе з'яўляецца сказ з пытальнікам: «Навошта ехаць за тысячы кіламетраў і слухаць замежныя мовы, калі сваю, чыстую, сучасную, цікавую, чуеш гады ў рады?» Навошта, патлумачце калі ласка, пазіраць на заморскія цуды, калі звычайны беларускамоўны чалавек зараз робіцца нейкай неверагоднасцю? Варта пакінуць гэтыя пытанні без адказу. Толькі застануцца і іншыя пытанні, накшталт: «Чаму вы не размаўляеце на роднай мове?», «Як вы ставіцеся да беларускамоўных кніг, тэлесерыялаў, праграм тэлебачання?».

Пытанні. Шмат. Рытарычныя.

Так, так! Нават атрымаўся нейкі парадокс: з аднаго боку — рытарычнасць, а з другога — адказы, якія існуюць усё ж. І валодаюць імі ў першую чаргу, вядома ж, тыя людзі, якія прапускаюць праз сябе кожнае беларускае слова, кожную інтанацыю, кожны знак прыпынку. Мне пашанцавала чуць поўныя любові словы прызнання роднай мове, словы ўдзячнасці. Мне пашанцавала бачыць светлы твар выпадковай знаёмай, якая пайшла па нялёгкім шляху, выбраўшы беларускую мову ў якасці спадарожніцы. Згадзіцеся, што зараз чамусьці размова па-беларуску часам успрымаецца людзьмі неадназначна: ці то адвыклі, ці то... Не ведаю, якое яшчэ можа быць «ці то», напэўна, у кожнага чалавека сваё, па-свойму аргументаванае.

А вось маёй гераіні не трэба шукаць, падбіраць словы для нейкага апраўдання: «Я нікому нічога не збіраюся навязваць. Я не хачу нічога тлумачыць, мне аплявала. Я размаўляю, як мне падабаецца, і мне падабаецца, як я размаўляю. Беларуская мова — гэта частка майго жыцця, частка, без якой я ўжо не я. Ведаеш, мне нават сны сняцца па-беларуску. Гэта маё!»

Зразумела, што пачуўшы такі праніклівы адказ яшчэ зусім маладой дзяўчыны, нельга не паверыць у светлую будучыню роднага слова. А як жа інакш? Калі моладзь, хай сабе хоць адзін яе прадстаўнік, у сне размаўляе па-беларуску — гэта, я ўпэўнена, добры знак. Мова не памрэ, не згіне, не адступіцца ад нас, а мы — ад яе.

**Вольга НЯХЛЕБАВА.**

# Царква рыхтуецца ісці ў мір

**З першых вуснаў**

**Напярэдадні першага візіту ў Беларусь новага Патрыярха Рускай праваслаўнай царквы у сталіцы адбылося некалькі лекцый протадыякана Андрэя КУРАЕВА, прафесара, багаслова і публіцыста. Наш карэспандэнт пабываў на адной з іх, каб пачуць, да чаго рыхтуе аўдыторыю самы медыйны праваслаўны прапаведнік.**

## ПРА СІМФОНІЮ ЎЛАДЫ І ЦАРКВЫ

Адразу папярэджу, што гэтыя нататкі з лекцыі — не дакладныя цытаты, а прапушчаныя праз свядомасць слухача развагі вядомага праваслаўнага публіцыста. Тое, што «зачапіла» і запомнілася.

Ён пачаў з палітыкі. Аднак потым высветлілася, што гэта мае непасрэднае дачыненне да тэмы лекцыі. ***Тэма была «Моладзь і сучасная культура» («Назва бязглуздая, бо моладзі няма. Ёсць канкрэтныя людзі: Таня, Вася, Дзіма... Усе яны вельмі розныя. Сучаснай культуры таксама няма. Зноў жа, ёсць розныя напрамкі, плыні, людзі. Сучасная культура — гэта і Растраповіч, і рэп, і Канстанцін Кінчаў, і многае іншае»...).***

Андрэй Кураеў патлумачыў аўдыторыі сімволіку двухгаловага арла. «Гэты атрыманы ў спадчыну ад Візантыйскай імперыі сімвал — цалкам царкоўны. Ён сімвалізуе сімфанічныя адносіны царства і патрыяршаства». Адно цела, але розныя кампетэнцыі, падзел паўнамоцтваў. Царква не крытыкуе агульную палітыку дзяржавы, але і не дапускае ўмяшання дзяржавы ва ўласную справу. Спробы ціску дзяржаўнай улады на Царкву былі, але яны ніколі так і не закранулі догмаў веры. Праваслаўная царква мянялася толькі абрадава, але ніколі — у сваёй сутнасці.

З прынцыпу сімфанічнасці Царквы і ўлады выцякала стаўленне да манархіі, у аснову якога было пакладзена паслушэнства. Так было раней.

Цяпер цара няма, і псіхалагічнае аднаўленне манархіі наўрад ці магчыма. Сучасны чалавек навучыўся цаніць свабоду. Адсюль асаблівасць сучаснага свету — у ім няма адназначных лідараў.

Раней місіянеры спярша звярталіся да лідара, і ўжо праз яго — да народа. Так адбылося з князем Уладзімірам, хрысціцелем Русі, і са многімі іншымі правіцелямі і краінамі. Цяпер жа агульнага аўтарытэта для ўсіх людзей няма. Нехта прыслухваецца да меркавання навукоўца, нехта — вядомага спартсмена, а нехта — да меркавання поп-зоркі.

«Сучаснае грамадства надзвычай дысперснае. Розныя групы бачаць сваімі лідарамі розных людзей. Для Царквы гэта азначае наступнае: яна павінна знайсці агульную мову з рознымі субкультурамі. У Царкве павінны быць людзі, якія ўмеюць размаўляць на розных мовах. Патрэбна новая Пяцідзясятніца».

## ПРА НЕАБХОДНАСЦЬ ВЫХАДУ З ІЗАЛЯЦЫІ

Словы Хрыста пра тое, што чалавек, які будзе мець веру памерам з гарчычнае зерне, зможа зрушыць горы, азначае, што горы зрушыць лягчэй, чым змяніць чалавечую душу. Аднак сёння мы з'яўляемся сведкамі таго, як людзі, пра якіх і падумаць было нельга, павярнуліся да веры, як памяняліся іх лёсы. Не заўважаць гэты відавочны цуд, замоўчваць яго — блюзнерства, лічыць багаслоў.

**У сучасным свеце важна навучыцца слухаць, чуць і разумець адно аднаго. Для самой Царквы гэта даецца з цяжкасцю. Надта яна прывыкла жыць у ізаляцыі, ахоўваць свае святыні ад бруду. Аднак бясконца жыць са свядомасцю гета нельга.**

У сучасным свеце важна навучыцца слухаць, чуць і разумець адно аднаго. Для самой царквы гэта даецца з цяжкасцю. Надта яна прывыкла жыць у ізаляцыі, ахоўваць свае святыні ад бруду. Аднак бясконца жыць са свядомасцю гета нельга.

Жаданне праваслаўных агарадзіць сябе выцякае не толькі са спадчыны савецкіх часоў. Андрэй Кураеў заўважыў, што ніколі не мог цалкам пагадзіцца з выявамі на старажытных візантыйскіх абразах, дзе Евангелле святыя трымаюць праз хустку. Чалавек тады разумеўся як крыніца агіды, ад яго трэба было святыню зберагчы. Аднак Царква была створана для таго, каб дарыць сябе людзям. Адсюль у ёй павінна быць любоў да чалавека, да разнастайнасці людзей.

Праваслаўныя завяршаюць крыжовы знак на левым плячы ў знак таго, што Хрыста яны пакідаюць у сэрцы. Католікі — на правым, у знак таго, што Хрыстос застаецца ў добрых справах, якія робяцца правай рукой. Абодва знакі з'яўляюцца правільнымі, і трэба аб'яднаць першае і другое.

Кураеў нагадаў гісторыю Праабражэння Гасподняга. Калі апосталы, пасля таго, як убачылі Боскасць свайго Настаўніка, прасілі Хрыста дазволіць застацца з Ім на гары. Але ў адказ яны пачулі забарону. Тым, хто ўбачыў святло Ісціны, неабходна набрацца мужнасці і спусціцца з гары, здолець увайсці ў цемру, каб праз сябе данесці гэта святло да іншых. Царква павінна ўварвацца ў цэнтр зла, каб перамагчы яго, упэўнены пратадыякан-місіянер. Збавіцель наказаў апосталам ісці ў свет.

## ПРА ЎМЕННЕ РАЗУМЕЦЬ ІНШЫХ

На жаль, у масавай царкоўнай свядомасці прывыклі бачыць усё ў чорна-белых колерах. Вернікі часта пра тое, чым жыве сучасны свет, разважаюць: гэта дрэнна, бо адцягвае ад малітвы. Аднак так бывае не абавязкова. Дрэнна тое, што расчалавечвае чалавека, пазбаўляе яго свабоды. «Калі ты растаеш у гуках, перастаеш належаць самому сабе, тады гэта не ёсць добра», — прывёў айцец Кураеў у прыклад стаўленне чалавека да рок-музы

Прэм'ера рубрыкі

# «ЗВЯЗДАРЫНАЧКА»

**Колькі ж на нашай Бацькаўшчыне ўсяго цікавага, часта забытага намі! Колькі разоў мы казалі: «Вунь, якія ў нашых суседзяў поспехі! Якія там адораныя людзі!» — але ж нават не здагадваліся, што, магчыма, гэта не суседзі, а гэта мы, нашы землякі, нашы родзічы. Мы не можам іх забываць, павінны ведаць і шанаваць, бо гэта частка нас... Менавіта дзеля гэтага ў нашай газеце адкрываецца новая рубрыка «Звяздарыначка», у кожным выпуску якой вам будуць прапанаваныя 13 пытанняў, пошукі адказаў на якія, спадзяёмся, стануць для вас не толькі цікавымі, але і карыснымі, запаўняючы і магчымыя прагалы ведання гісторыі нашай Айчыны. З кожнай віктарыны вы зможаце даведацца шмат новага з культуры, гісторыі, спорту, эканомікі...; пазнаёміцеся з выбітнымі асобамі, жыццё якіх наклала вялікі адбітак на ход гісторыі; акуняцеся ў міфічны свет нашых продкаў; уявіце сябе архітэктарам старажытных збудаванняў...**

**Карацей, што тут казаць: прымайце ўдзел і перамагайце! — бо ўсе адказы на пытанні вы можаце дасылаць у рэдакцыю, каб, набраўшы найбольшую колькасць балаў, па заканчэнні 10 «звяздарыначак» атрымаць прыз ад нашай газеты! А даслаць лісты вы можаце двума шляхамі: традыцыйна, праз пошту з пазнакай «Звяздарыначка» на адрас рэдакцыі (220013, г. Мінск, вул. Хмяльніцкага, 10-а) і на рэдакцыйную электронную скрыню (info@zvyazda.minsk.by). Дапамагаць нам у стварэнні пытанняў-адказаў будзе спадар Юрась БОХАН, загадчык кафедры эканамічнай гісторыі БДЭУ, прафесар БДУ і вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі — такім чынам дакладнасць, як кажуць, гарантаваная! Хочацца верыць, што вы ўпадабаеце гэтую новую інтэрактыўную інтэлект-рубрыку!**

**Вядучы рубрыкі Мікола ТАМАШЭВІЧ.**

## ПЕРШЫ ТУР ВІКТАРЫНЫ

**1.** Як называецца першая беларуская газета, што захавалася да сёння?

**2.** У чым галоўнае вонкавае адрозненне адбудаванага гатэля «Еўропа» ад сапраўднага?

**3.** Як называўся першы мастацкі фільм «Беларусьфільма», рэжысёрам якога з'яўляўся Юрась Тарыч?

**4.** Назавіце адзінага беларускага лаўрэата Нобелеўскай літаратурнай прэміі. Гэты чалавек нарадзіўся на Падляшшы і доўгі час асэнсоўваўся выключна з Польшчай.

**5.** Колькі максімальна моваў былі дзяржаўнымі ў Беларусі? Якія гэта мовы?

**6.** Беларускі яўрэй, які атрымаў мастацкае прызнанне за межамі Беларусі. Хто гэта (здагадайцеся па фота)?

**7.** Колькі ўсяго медалёў заваявалі беларускія алімпійцы ад Алімпіяды 1952 года ў Хельсінках да сёння?

**8.** Беларускі шляхціц з роду Бельскіх у 1656 годзе стварыў у Стакгольме першы ў свеце дзяржаўны банк, а таксама вынайшаў першыя ў Еўропе папяровыя банкноты. Хто гэта і з якім горадам ВКЛ звязаны ягоны лёс?

**9.** Якія рэвалюцыйныя на той час нормы і артыкулы змяшчаліся ў Статуце Вялікага Княства Літоўскага?

**10.** «Раней людзі ведалі той час, калі да іх смерць прыйдзе, а цяпер акрамя Бога ніхто і не ведае. Як гэта зрабілася? Крочыў Бог па дарозе і бачыць: гародзіць чалавек саломай плот. — Чаму ты гародзіш саломай плот? — пытаецца Бог у чалавека. — Вядома чаму!..» Працягніце гісторыю.

**11.** 27 верасня 1605 года адбылася буйная бітва між войскамі Вялікага Княства Літоўскага і Швецыі. Напішыце, хто кіраваў войскам ВКЛ?

**12.** Назавіце назву беларускага мястэчка, якое ў XVIII ст. лічылася сталіцай цыганоў (г.зн. дзе жыў цыганскі барон).

**13.** Як звалі нашага суайчынніка, які ў 1650 годзе выдаў у Нідэрландах падручнік па артылерыйскім майстэрстве, які на доўгія часы стаў штатным падручнікам ваенных акадэмій Еўропы?

### ЗВАЛІЎСЯ З ДВУХ МЕТРАЎ — НАСМЕРЦЬ

Жыхар г. Ляхавічы праводзіў дэмантаж сцяны на ферме в. Нівішча і зваліўся. І хоць вышыня той сцяны была ўсяго два метры і чалавека даставілі ў бальніцу, ён памёр ад цяжкіх пашкоджанняў.

### «П'ЯНЫЯ» ЖЫГУЛІ СУПРАЦЬ АЎТОБУСА

«Жыгулі» выскачылі на галоўную магістраль каля крамы «Пінск» у Баранавічах і сутыкнуліся з аўтобусам. У машыне акрамя вадзіцеля было пяць пасажыраў, якія і пацярпелі, а вадзіцель вылез з аўтамабіля і кінуўся наўцёкі. Каля аднаго з дамоў у Паўночным мікрараёне ўцекачу стала кепска і яго падабрала «хуткая дапамога», якая праязджала міма. У «Жыгулях» міліцыянеры знайшлі разбітыя бутэлькі ад гарэлкі, ды і пасажыры былі п'яныя. У аўтобусе ніхто не пацярпеў.

### СМЕРЦЬ ПАД КАМБАЙНАМ

На полі, побач з в. Сялоўшчына Бярозаўскага раёна, камбайнам «Палессе-800» быў траўмаваны мясцовы жыхар. 74-гадовага мужчыну выратаваць не ўдалося.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

### УКРАЛІ Ў БАБУЛІ... ТАНОМЕТР

У дом да 84-гадовай пенсіянеркі з вёскі Масевічы Маларыцкага раёна залезлі два зладзюжкі-аднавяскоўцы і вынеслі 800 тысяч рублёў, прадукты і нарыхтоўкі на зіму. Забралі нават апарат для вымярэння ціску.

**Яна СВЕТАВА.**

### РАСЧАХЛІЎ СТРЭЛЬБУ? ЗНАЧЫЦЬ, БРАКАНЬЕР!

На тэрыторыі Баранавіцкага лясгаса супрацоўнікі Слонімскай міжрайінспекцыі аховы прыроды тармазнулі аўтамашыну і ўбачылі трох жыхароў з Ляхавіцкага раёна. Тыя сядзелі з расчахлёнымі стрэльбамі і трымалі пры сабе паляўнічага сабаку. Ліцэнзіі на паляванне ў іх не было, а гэта ўжо лічыцца браканьерствам. Парушальнікам пагражае штраф да 50 базавых велічыняў і канфіскацыя стрэльбаў.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

### КАЛЯ ГАЗАПРАВОДА... АРТЫЛЕРЫЙСКІ СНАРАД

У Дубровенскім раёне каля вёскі Рэдзькі пры аглядзе газаправода «Ямал-Еўропа» (на 415-м кіламетры) работнік арганізацыі, якая абслугоўвае газапровад, знайшоў артылерыйскі снарад калібру 105 міліметраў часоў Вялікай Айчыннай вайны. Небяспечную знаходку знішчылі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### У СТАЛІЦЫ — ТАТАРСКІ СКВЕР

Дэпутаты Мінгарсавета зацвердзілі прапанаваныя Камісіяй па найменні і перайменні праспектаў, вуліц, плошчаў і іншых складнікаў горада варыянты назваў скверу, вуліц і могілак.

Сквер у межах вуліц Чырвонаармейскай — К. Маркса — Энгельса — праспекта Незалежнасці атрымаў назву Аляксандраўскі. Сквер паміж ЦУМам і бібліятэкай імя Пушкіна назвалі Бондараўскім, а ў межах вуліц Татарскай — Грыбаедава — Ігнаценкі Татарскім. Зялёная зона, абмежаваная вуліцамі Дзекабрыстаў — Парашутнай — Папаніна будзе з гэтага часу называцца Грушаўскім скверам, а вуліцамі Харкаўскай — Берута — Верашчагіна — Тучынскім скверам. Сквер у межах вуліц Кастрычніцкай — Ульянаўскай — Беларускай і ракі Свіслач атрымаў назву Ляхаўскі.

Новая вуліца ў раёне Адоеўскага — Бельскага — Панамарэнкі будзе насіць імя беларускага пісьменніка, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, заслужанага дзеяча культуры БССР Канстанціна Ціханавіча Кірыенкі. Акрамя таго, перайменаваныя могілкі: «Піянерскія» — у «Крупцы», а «Дружба» сталі «Брылеўскімі».

**Наталля ЗАЯЦ, «Мінск—Навіны».**


## ИЗВЕЩЕНИЕ

**о созыве внеочередного общего собрания акционеров ОАО «ЭКСПЕРИМЕНТАЛЬНЫЙ ЗАВОД им. Н. ГАСТЕЛЛО»**

**Собрание состоится 8 октября 2009 г. в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Пинская, 18, в актовом зале Общества.**

**Регистрация участников Собрания проводится в день и по месту проведения Собрания с 14.30 до 15.45.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О результатах закрытой подписки на акции дополнительного выпуска ОАО «ЭКСПЕРИМЕНТАЛЬНЫЙ ЗАВОД им. Н. ГАСТЕЛЛО».
2. Об утверждении решения о выпуске акций ОАО «ЭКСПЕРИМЕНТАЛЬНЫЙ ЗАВОД им. Н. ГАСТЕЛЛО».
3. Об увеличении размера уставного фонда ОАО «ЭКСПЕРИМЕНТАЛЬНЫЙ ЗАВОД им. Н. ГАСТЕЛЛО».
4. О внесении изменений и дополнений в устав ОАО «ЭКСПЕРИМЕНТАЛЬНЫЙ ЗАВОД им. Н. ГАСТЕЛЛО».

С информацией (материалами), подлежащими предоставлению акционерам, при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья), начиная со 2 октября 2009 года в приемной директора Общества с 9.00 до 16.00, а в день проведения Собрания — по месту его проведения.

**Совет директоров**
**ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло».**

УНП 100010116.


## ИНФОРМАЦИОННОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ИВАЦЕВИЧСКИМ РАЙОННЫМ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫМ КОМИТЕТОМ АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

Характеристика земельных участков, выставляемых на аукцион

| Местонахождение (адрес земельного участка) | г. Ивацевичи, ул. Гамалицкого, 38А (далее – лот № 1) | г. Ивацевичи, ул. Депутатская, 45 (далее – лот № 2) | г. Коссово, ул. Филипповича (далее – лот № 3) | д. Оброво, ул. Ленина, 18 (далее – лот № 4) |
|---|---|---|---|---|
| Площадь участка, га | 0,1591 | 0,1224 | 0,0081 | 0,2013 |
| Виды земель | общего пользования | неиспользуемые | неиспользуемые | неиспользуемые |
| Вещное право на земельный участок | аренда сроком на 20 лет | аренда сроком на 50 лет | аренда сроком на 5 лет | аренда сроком на 50 лет |
| Целевое назначение земельного участка | для строительства магазина | для строительства молодежно-развлекательного центра | для установки торгового павильона | для строительства магазина |
| Кадастровый номер участка | 123450100001002587 | 123450100001001761 | 123451000001000739 | 123486506601000389 |
| Начальная (стартовая) цена земельного участка, рублей | 6 550 670 (шесть миллионов пятьсот пятьдесят тысяч шестьсот семьдесят) | 17 056 920 (семнадцать миллионов пятьдесят шесть тысяч девятьсот двадцать) | 215 300 (двести пятнадцать тысяч триста) | 89 820 (восемьдесят девять тысяч восемьсот двадцать) |
| Наличие строений, сооружений на участке | нет | нет | нет | нет |
| Наличие инженерных коммуникаций на прилегающей территории | линия электропередачи, газопровод, связь | линия электропередачи, водопровод, канализация, газопровод, связь | водопровод, канализация | линия электропередачи |
| Состояние дорожной сети улиц | гравийное покрытие | грунтовое покрытие | усовершенствованное покрытие | гравийное покрытие |
| Ограничения в использовании | на площади 0,0020 га в охранной зоне воздушной линии электропередачи напряжением до 1000 вольт | на площади 0,0215 га в охранной зоне напорной канализации | нет | нет |

Аукцион состоится **30 октября 2009 года** в 14.30 в малом зале райисполкома по адресу: Брестская область, г. Ивацевичи, ул. Ленина, д. 44, каб. 116.

Для участия в аукционе индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) представляет комиссии следующие документы:

заявление об участии в аукционе;

копия платежного поручения, заверенная банком, о внесении суммы залога в размере: лот № 1 – **655 070** рублей, лот № 2 – **1 705 690**, лот № 3 – **21 530**, лот № 4 – **8 980** рублей на р/с № 3641000000032 в филиале № 111 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Ивацевичи, код банка 623, получатель платежа – Ивацевичский райисполком, УНП 200100489, назначение платежа 04002;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов;

представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц, индивидуальные предприниматели предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой.

Аукцион проводится при условии наличия не менее двух участников аукциона по каждому лоту.

Передача земельных участков в аренду производится без изменения их целевого назначения с условиями:

внесения победителями аукциона платы за право заключения договоров аренды;

возмещения победителями аукциона исполкому расходов по организации и проведению аукциона в размере: **1 012 290** рублей по лоту № 1, **345 670** рублей по лоту № 2; **429 670** рублей по лоту № 3, **976 950** рублей по лоту № 4;

заключения победителями аукциона с Ивацевичским райисполкомом договоров аренды земельных участков и осуществления в двухмесячный срок со дня получения решения райисполкома о предоставлении земельных участков в аренду государственной регистрации прав на земельные участки;

получения победителями аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ, разработки строительного проекта на строительство объектов и осуществления начала строительства объектов в течение шести месяцев со дня получения свидетельства о государственной регистрации права на земельный участок;

осуществления строительства объектов в сроки, определенные проектно-сметной документацией;

переноса с застраиваемого участка и устройства гравийного покрытия проезжей части пер. Торгового победителем аукциона до начала строительства объекта (по лоту № 1);

строительства объекта в 2 надземных этажа с благоустройством территории до проезжей части улицы с устройством автомобильной стоянки (по лоту № 2).

Договор аренды земельного участка по результатам аукциона подписывается сторонами после принятия райисполкомом решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка и не позднее 2 рабочих дней после оплаты победителем аукциона стоимости предмета аукциона, расходов по организации и проведению аукциона. Указанную плату победители аукциона обязаны внести в течение 10 рабочих дней со дня принятия Ивацевичским райисполкомом решения о предоставлении земельных участков.

Предварительное ознакомление с земельными участками на местности проводится при подаче заявления.

Заявления на участие в аукционе принимаются с **30 сентября 2009 г.** по адресу: 225291, Брестская область, г. Ивацевичи, ул. Ленина, 44, каб. 422 с 8.00 до 17.00 по рабочим дням по 26 октября 2009 года включительно.

**Контактные телефоны в г. Ивацевичи: (801645) 2 13 69, 2 54 76.**

## РУП «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 27 октября 2009 г. в 15.00 по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54, состоится АУКЦИОН по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «Журавинка» в составе Лота № 1:

| | |
|---|---|
| Наименование имущества | капитальное строение с инвентарным номером 710/С-59234 (здание мини-кафе) общей площадью 43,3 кв.м |
| Адрес | Могилевская обл., г. Бобруйск, п. Еловики, д. 1а |
| Организатор торгов | РУП «Белтехинвентаризация», г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54, УНП 190305149 |
| Начальная цена продажи, рублей без учета НДС | 79 941 460 |
| Размер задатка, руб. | 3 997 070 |
| Номер р/с для перечисления задатка | Получатель платежа ОАО «Журавинка» – р/с 3012790150019 в ОАО «Белинвестбанк» отделение № 831 г. Бобруйск Головного филиала по Могилевской области, код 153801712, УНП 700067623, ОКПО 14775616 |
| Площадь земельного участка, га | 0,0418 га. Кадастровый номер 741000000003000926. Правовой режим – право постоянного пользования. |
| Характеристика объекта | здание мини-кафе 2-эт. кирпичное, отдельно стоящее, фундамент бет., перекрытия ж/бет. плиты, кровля совмещенная, фасад – металлочерепица, отопление от собственного котла, электроснабжение; имеется прилегающее к зданию асфальтобетонное покрытие площадью 148 кв.м |
| Условия продажи | аукцион без условий |
| Срок заключения договора купли-продажи | в течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Условия оплаты | по договоренности Победителя торгов с Собственником имущества при заключении договора купли-продажи |
| Срок подачи документов, осмотра объекта и внесения задатка | по 26 октября 2009 г. включительно |

**Для участия в аукционе в адрес Организатора торгов необходимо предоставить:** заявление на участие; заверенную банком копию платежного поручения о внесении размера задатка, паспорт; **для резидентов Республики Беларусь: юр. лицам** – доверенность представителю юр. лица (в случае необходимости таковой), копии и оригиналы учредительных документов и свидетельства о гос. регистрации; **представителям физ. лиц** – нотариально заверенную доверенность; **для нерезидентов Республики Беларусь: юр. лицам** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена не ранее чем за 6 мес. до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; **юр. лицам и физ. лицам** – документ о состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в устан. порядке переводом на бел. (рус.) язык; **представителям юр. и физ. лиц** – легализованную в установленном порядке доверенность.

**Выигравшим торги на аукционе признается лицо, предложившее наиболее высокую цену.** Задаток, внесенный Победителем будет зачтен в счет окончательной стоимости приобретенного имущества, остальным участникам будет возмещен Собственником имущества в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. **Организатор торгов или Продавец (Собственник) вправе снять объект с торгов до объявления его проданным.**

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляет Победитель (Претендент на покупку) не позднее 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона на основании счета-фактуры, выдаваемой Организатором торгов до проведения аукциона.

**Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 52 08 45, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

**по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества**

| | |
|---|---|
| Наименование предмета аукциона | Государственное имущество и право заключения договора аренды земельного участка |
| Местонахождение недвижимого имущества | Брестская область, Столинский район, 1,2 км севернее железнодорожной станции «Припять» |
| Продавец недвижимого имущества | РТУП «Белорусское речное пароходство» тел. 8 (02351) 2 29 58 |
| Сведения о предмете аукциона | Государственное имущество включает в себя: сооружение (артскважина с кирпичной насосной 1986 г.п, общая площадь 9,0 кв.м) инв. № 135/С-7019, сооружение (трансформаторная подстанция 1986 г.п., общая площадь 36,6 кв.м, 1-эт. кирпич.) инв. № 135/С-7018, сооружение (очистные сооружения, площадь 46,0 кв.м) инв. № 135/С-7021, сооружение (водонапорная башня 1986 г.п, объем 171 куб.м из железобетонных панелей, общая площадь 9,0 кв.м.) инв. № 135/С-7020, изолированное помещение (административно-бытовое помещение, 3-эт. кирпич., общая площадь 506,3 кв.м) инв. № 135/D-3119, изолированное помещение (котельная 1986 г.п, кирпичное, общая площадь 49,7 кв.м) инв. № 135/D-3120, изолированное помещение (ремонтные мастерские 1986 г.п, кирпичное, общая площадь 261,2 кв.м) инв. № 135/D-3121. Земельный участок площадью 0,5498 га, имеются ограничения в использовании земель в водоохранной зоне р. Припять на площади 0,5498 га, срок аренды – 50 лет. |
| Начальная цена единого предмета аукциона, руб. | 379 951 309 |
| Сумма задатка, руб. | 37 995 130 |
| Реквизиты счета для перечисления задатка | р/с 3642902530005 головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538. Срок внесения – по 12 октября 2009 г. включительно. |
| Организатор аукциона | Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, д. 11, тел. (0162) 23 44 06, 21 19 82, 23 44 78. www.brest-region.by, fond@brest-region.by |

Повторный аукцион состоится **13 октября 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

**Участник, ставший победителем аукциона (претендент на покупку), обязан:** подписать протокол аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результаты такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Порядок организации и проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462, Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже некоторых объектов республиканской собственности, утвержденной постановлением Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь от 30 марта 2009 г. № 36.

Более подробная информация об участии в аукционе опубликована в газете «Звязда» от 15 августа 2009 г. № 152.

**Заявления на участие в повторном аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 17.30 по рабочим дням по 12 октября 2009 года включительно.**

## ГОМЕЛЬСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ТЕРРИТОРИАЛЬНЫЙ ФОНД ГОСУДАРСТВЕННОГО ИМУЩЕСТВА

**проводит 6 октября 2009 г. повторный аукцион по продаже объектов недвижимости государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества**

**ЛОТ № 1**

**Капитальное строение (здание аптеки № 113) инв. № 340/С-1893 и право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.**

**Сведения о предмете аукциона:** одноэтажное здание, общей пл. 73,26 кв.м, стены блочные обложены кирпичом, перекрытия деревянные, год постройки – 1986.

**Местонахождение:** Гомельская область, Лоевский район, дер. Бывальки, ул. Комсомольская, 78.

**Условия использования** – по целевому назначению, или при перепрофилировании для обслуживания жилого дома.

**Земельный участок – 0,0628 га. Срок аренды земельного участка 20 лет.**

**Начальная цена единого предмета аукциона – 38 723 343 руб.**, в т.ч. имущества – **38 719 243 руб.** (снижена на 20 %), право заключения договора аренды земельного участка – **4 100 руб.** Расходы, связанные с формированием земельного участка и государственной регистрацией в отношении этого участка, составляют **111 011 руб.**

**Задаток, вносимый участником, – 3 500 000 рублей**.

**Продавец:** имущества – Гомельское торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Фармация», г. Гомель, ул. Б. Хмельницкого, 75, тел. (0232) 40 09 94; права заключения договора аренды земельного участка – Лоевский районный исполнительный комитет, г. п. Лоев, ул. Ленина, 2, тел. (02347) 4 22 34.

**ЛОТ № 2**

**База РРСУП «Мозырьлесремстрой»: капитальные строения – ремонтно-механические мастерские инв. № 330/С-5942, административное здание инв. № 330/С-5448, склад товарно-материальных ценностей инв. № 330/С-5450, склад горюче-смазочных материалов инв. № 330/С-5453, бытовые помещения инв. № 330/С-5460, мастерские инв. № 330/С-5932, проходная инв. № 330/С-5446, трансформаторная подстанция инв. № 330/С-3128, пилорама инв. № 330/С-5452; линии электросетей инв. № 330/С-13069 и право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.**

**Сведения о предмете аукциона:** - административное здание – 2-эт. кирпичное здание, пл. 355,0 кв.м; проходная – 1-эт. кирпичное здание, пл. 59,0 кв.м; мастерские – 1-эт. кирпичное здание, пл. 169,0 кв.м; склад ТМЦ – 1-эт. кирпичное здание; пл. 105 кв.м; трансформаторная подстанция – 1-эт. кирпичное здание, пл. 41,4 кв.м; склад ГСМ – 1-эт. кирпичное здание, пл. 101,0 кв.м; пилорама – 1-эт. здание, пл. 139,0 кв.м; бытовые помещения – 2-эт. кирпичное здание, пл. 382,1 кв.м; ремонтно-механические мастерские – 1-эт. панельное здание, пл. 2329,0 кв.м; линии электросетей.

**Местонахождение:** Гомельская область, г. Мозырь, пер. Транспортный, д. 3.

**Условия использования** – под производственную базу.

**Земельный участок – 2,8388 га. Срок аренды земельного участка 25 лет.** Земельный участок площадью 0,1512 га имеет ограничения в использовании (охранная зона линии электропередачи напряжением 10 кВ).

**Начальная цена единого предмета аукциона – 763 577 856 рублей**, в т.ч. имущества – **520 633 578 рублей** (снижена на 20 %), права заключения договора аренды земельного участка – **242 944 278 рублей.** Расходы, связанные с формированием земельного участка и государственной регистрацией в отношении этого участка, составляют **419 296 руб.**

Задаток, вносимый участником – **70 000 000 рублей.**

